П-ы ГОД ВЫДАНЬНЯ

Пралетарыі ўсіх краёў, зл учайцеся!

Савецкая Беларусь

ОРГАН
ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ
САВЕТАЎ
Рабочых, Сялянскіх і Чырванаармейскіх
ДЭПУТАТАЎ
і
САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ
Б. С. С. Р.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ
МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і К. Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі — № 478. Рэдактара — № 769. Канторы — № 244.

Матар'ял прымаецца — з 9-й да 3½ г.
Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не зварочваюцца.

Штодзённая газэта
Кошт нумару 5 кап.

№ 42 (2830)
ЧАЦЬВЕР
20 лютага 1930 году.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:
За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Зьыш тарыфу бярэцца 10 проц. дз. падатку.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:
За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Публікацыі ЗАГС'у — 3 руб.

За арганізацыю працы ў калгасах!

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі в кожным днём пашыраецца. На нашых вачох растуць буйныя калгасы, якія складаюцца з цэлых сельсаветаў, раёнаў і нават округ. Ня так даўно ішла гутарка аб вызначэньні толькі некаторых раёнаў і аднэй акругі для суцэльнай калектывізацыі, а зараз жыцьцё пайшло далёка наперад. Амаль у кожнай акрузе мы маем па 2-3 раёны, якія абвясьцілі сябе раёнамі суцэльнай калектывізацыі. Гэта дае нам падставы лішні раз падкрэсьліць, што да пачатку вясны мы будзем мець значнае перавышэньне ўсіх плянаў па калектывізацыі сельскай гаспадаркі Савецкай Беларусі.

Зараз паўстала вялікая задача: —дагнаць і перагнаць ня толькі кулацкія гаспадаркі нашага краю, але і амэрыканскія фэрмэрскія па лініі двух асноўных паказальнікаў —прадукцыйнасьці працы і таварнасьці.

Аграмаджаны сэктар сельскай гаспадаркі колькасна і якасна ставіцца галоўным. Таму арганізацыя працы ў калгасах на даным этапе разьвіцьця калектывізацыі набывае рашаючае значэньне. **Пытаньне якасьці калгасаў галоўным чынам упіраецца ў пытаньне правільнай пастаноўкі працы ўнутры іх. Ад гэтага залежыць моц калгасаў, гэта дае ім магчымасьць узьняць прадукцыйнасьць працы і таварнасьць сваёй прадукцыі.**

Арганізацыя працы ў калгасах патрабуе асобай напружанасьці і настойлівай работы ў гэтым напрамку. Цяжкасьці заключаюцца ня толькі ў тым, што няма дастатковага вопыту па арганізацыі працы ў буйных калгасах, таму, што самі буйныя калгасы зьявішча зусім новае, але і таму, што ў калгасах **трэба арганізоўваць масу, якая прызвычаілася працаваць паасобку на аснове індывідуальнай, абмежаванай сваімі ўласнымі інтарэсамі, гаспадаркі.**

Ня гледзячы на відавочную важнасьць пытаньня арганізацыі працы ў калгасах, гэтай галіне работы за апошні год аддаецца зусім мала ўвагі. Недаацэнка пытаньня арганізацыі працы ў калгасах аб'ектыўна прыводзіць да стварэньня ўмоў капіталістычнай эксплёатацыі, што скажае іх сацыяльны твар. **Таму справа арганізацыі працы ў калгасах павінна быць неадкладна вырашана.**

Арганізацыя працы ў калгасах, якая шчыльна зьвязана з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы, павінна паставіць сваёй мэтай ня толькі павялічэньне пасеўнай плошчы, але і ўзьняцьця ўраджайнасьці.

Суцэльная калэктывізацыя, якая вядзе за сабой раскулачваньне, у 1-ы год павінна ня толькі пакрыць таварныя лішкі кулацкіх гаспадарак але і ў некалькі раз іх перавысіць. Калгасы павінны так арганізаваць сваю працу, каб узьняць прадукцыйнасьць, якая-б забясьпечыла пралетарскаму гораду ў абмен на ўзрастаючую базу сродкаў вытворчасьці і прадметаў спажываньня, якую дасьць вёсцы наша сацыялістычная прамысловасьць, значна большую колькасьць хлеба і таварных лішкаў, чымся яна здабывала ў мінулыя гады.

Зразумела, наколькі арганізацыя працы будзе садзейнічаць далейшаму ўздыму калгасаў, розныя суцэльныя праслойкі будуць зацікаўлены ў рознай арганізацыі працы. Кулацтва і тут пастараецца ўзяць пад свой уплыў некаторую, менш устойлівую частку калгасьнікаў з мэтай выкарыстаньня іх для падрыву сацспаборніцтва, працдысцыпліны і г. д. **Для таго, каб даць рашучы адпор гэтаму ўплыву, неабходна барацьба ня толькі з хістаньнямі часткі калгасаў, але і бязьлітасная барацьба з праявамі правага апартунізму ў вясковых партарганізацыях.**

Вакол пытаньня правільнай арганізацыі працы сирэчкі галоўным чынам будуць гуртавацца вакол норм расцэнак у калгасах. Было-б вялікай памылкай увесьці аднолькавую норму расцэнак ува ўсе калгасы. Адзін калгас у многім адрозьніваецца сваім становішчам ад другога. **Таму пры выпрацоўцы тарыфных расцэнак і павінны быць улічаны асаблівасьці кожнага калгасу.**

Мы на старонках нашай газэты пачынаем сыстэматычнае высьвятленьне гэтага важнага пытаньня. **Рабселькоры ў гэтай рабоце павінны нам дапамагчы праз прысылку належнага матар'ялу для газэты.** Гэта дасьць магчымасьць разгарнуць абмен вопытам паміж калгасамі па пытаньнях арганізацыі працы ўнутры іх і своечасова зьвяшчаць недарэчнасьці, якія будуць сустракацца ў гэтай галіне.

ГАРСАВЕТЫ ПАВІННЫ ДАЦЬ ВЁСЦЫ

на кіруючую работу рабочых—членаў гарсаветаў, актывістаў, працуючых у саветах

Усім выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам БССР

АБ ПАСЫЛЦЫ РАБОЧАГА АКТЫВУ СА СКЛАДУ ГАРАДЗКІХ САВЕТАЎ У ВЁСКУ ДЛЯ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ

У мэтах узмацненьня сельскіх саветаў, якія павінны ажыцьцявіць задачы правядзеньня суцэльнай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і ліквідацыі кулацтва, як клясы, гарадзкія саветы павінны неадкладна разгарнуць масавую работу па пытаньні пасылкі ў вёску на кіруючую работу рабочых—членаў гарадзкіх саветаў, актывістых, працуючых у сэкцыях.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **прапануе** гарадзкім саветам вылучыць у працягу лютага ня менш наступнага ліку таварышоў для пасылкі іх на вёску: Менскі гарадзкі савет—40 чал., Барысаўскі—15 чал., Гомельскі—35 чал., Рэчыцкі—10, Віцебскі—35, Бабруйскі—20, Магілеўскі—20, Аршанскі — 15, Полацкі—5 і Мазырскі—5, прычым з гэтага ліку Менскі гарсавет павінен даць 10 рабочых Магілеўскай акрузе, 5—Аршанскай і 5—Бабруйскай. Віцебскі гарсавет—15 рабочых Полацкай акрузе і Гомельскі—15 рабочых Мазырскай акрузе. Колькасьць рабочых ад астатніх гарадзкіх саветаў вызначаецца апошнімі.

Гарадзкія саветы павінны ўжыць усе захады да таго, каб забясьпечыць пасьпяховасьць пасылкі рабочых з савецкага актыву—членаў гарадзкіх саветаў, сэкцый і г. д. у вёску, дабіваючыся пры гэтым шырокага разьвіцьця добраахвотнасьці. [illegible] кандыдатуры пасылае[illegible] ба паставіць на [illegible] сходаў рабочых, на [illegible] трэба [illegible] мачыць рабочым усе [illegible] часьць гэтага мерапрыемства з пункту погляду неабходнасьці ўзмацніць сельскія саветы лепшымі пралетарыямі гораду.

Неабходна ўтварыць грамадзкую думку вакол гэтага важнейшага палітычнага мерапрыемства—сустрэчы гораду з вёскай, садзейнічаньня кіраўніцтва з боку гарадзкога пралетарыяту ў правядзеньні суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі куляцтва, як клясы.

Пасылка рабочых-актывістых у вёску павінна разглядацца як пачэсная і адказьнейшая работа, на якую могуць быць пасланы толькі лепшыя загартаваныя рабочыя, палітычна падрыхтаваныя, добра разумеючыя сучасныя задачы партыі і савецкай улады ў вёсцы і ў той час добра знаёмыя з жыцьцём вёскі.

Адначасова з гэтым гарадзкія саветы павінны разгарнуць шырокую работу ў галіне пасылкі рабочых брыгад у вёску для ўдзелу ў правядзеньні справаздачна-праверачнай і перавыбарчай кампаніі [illegible] справе сацыялістычнае спаборніцтва паміж паасобнымі гарадзкімі саветамі, а таксама і іх сэкцыямі.

Як пасылка на сталую работу у сельскія саветы, гэтак і пасылка рабочых брыгад у вёску для правядзеньня справаздачна-праверачнай і перавыбарчай кампаніі і павінны быць праведзены зараз-жа, з дастатковай прапрапоўкай і абгаварэньнем гэтага пытаньня на агульных сходах рабочых і пленумах гарадзкіх саветаў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

17 лютага 1930 г.
гор. Менск.

Самарканд, ЦВК Узьбекскай ССР

Прэзыдыум ЦВК Беларусі ад імя пралетарыяту і працоўнага сялянства горача вітае рабочых і працоўнае сялянства братняй Узьбекскай ССР з пяцігодзьдзем яе існаваньня і будаўніцтва сацыялізму пад кіраўніцтвам Ленінскай кампартыі.

Ажыцьцяўляючы на тэрыторыі Узьбекскай ССР заветы І. Леніна ў галіне клясавай і нацыянальнай палітыкі сярод вызваленых Кастрычнікавай рэвалюцыяй працоўных мас і народаў Усходу, Узьбекская ССР, як частка Саюзу ССР, заўляецца моцным аплотам яго на Ўсходнім рубяжы і найлепшым доказам правільнасьці клясавай і нацыянальнай палітыкі савецкай улады.

Прэзыдыум ЦВК Беларускай ССР у дзень пяцігодзьдзя Узьбекскай ССР жадае ёй далейшых посьпехаў у галіне сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі шляхам індустрыялізацыі і калектывізацыі, паказваючы гэтым працоўным масам тых народаў Усходу, якія яшчэ знаходзяцца ў абцугох клясавага і нацыянальнага прыгнечаньня—Ленінові шлях да сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня.

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сэкратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Крызіс францускага ўраду

ПАГЛЫБЛЕНЬНЕ КРЫЗІСУ КАПІТАЛІСТЫЧНАЙ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ І ЎЗДЫМ РАБОЧАГА РУХУ —ПРЫЧЫНЫ АДСТАЎКІ ЎРАДУ ТАРД'Е

ПАРЫЖ, 18-II. Абмяркоўваючы ўрадавы крызіс, „Юманітэ" зазначае, што нікчэмнасьць прычэпкі для адстаўкі ўраду ня можа затушоўваць глыбокіх прычын падзеі. „Крызіс габінэту адлюстроўвае нясупыннае паглыбленьне крызісу капіталістычнай рацыяналізацыі. (Заслугоўвае ўвагі, што за апошніх 7 месяцаў падаецца ў адстаўку трэці ўрад).

Божная спроба капіталістычных урадаў вырашыць пастаўленыя перад імі тры асноўных праблемы, а імен на праблему капіталістычнай рацыяналізацыі, аграрны крызіс і ўздым рабочага руху—прыводзяць не да паслабленьня, а да ўзмацненьня супярэчнасьцяў. Капіталістычная рацыяналізацыя толькі ўзмацняе рэвалюцыйны ўздым рабочага руху.

Буржуазея, занепакоеная хваляй забастовачнага руху і актыўным адпорам рэпрэсій з боку рабочае клясы, магутнымі дэманстрацыямі пралетарыяту на абарону Савецкага Саюзу, імкнецца абавязкова мець моцны ўрад.

* * *

ПАРЫЖ. 18-II. Сацыялістычны друк ня ведае як трымаць сябе перад налўнасьцю ўрадавага крызісу. „Популер", не жадаючы паглыбляць існуючых у сацыялістычнай партыі супярэчнасьцяў па пытаньні аб удзеле ва ўрадзе, ня выказваецца ні за, ні супроць спроб заснаваньня „левага ўраду".

* * *

ПАРЫЖ, 17-II. Водлуг паведамленьня агенцтва Гаваса, 17-га лютага ў палаце дэпутатаў адбываліся бурныя спрэчкі наконт фінансавага закону. Міністр фінансаў, лічачы сваёй галоўнай задачай падтрыманьне раўнавагі бюджэту, некалькі разоў рашуча выступаў супроць прапаноў, якія выклікалі-б зьмяншэньне прыбыткаў і не адкрылі-б для ўраду магчымасьці новых рэсурсаў. Некаторыя дэпутаты нападалі на ўрад, зазначаючы на недастатковае зьніжэньне падаткаў. На вячэрнім пасяджэньні было пастаўлена пытаньне аб даверы'.

Спачатку яно атрымала большасьць у 20 галасоў, а затым, аднак, палата дэпутатаў выказала ўраду недавер'е пры галасаваньні фінансавага закону, які прадугледжвае зьніжэньне падаткаў на прыбытак замужняй жанчыны ад гандлёвага ці прамысловага прадпрыёмства.

А 21-й гадз. 50 хвіл. была перададзена прэзыдэнту Думэргу просьба аб адстаўцы габінэту. Прэзыдэнт згадзіўся на адстаўку.

* * *

ПАРЫЖ, 18-2. Водлуг паведамленьня агенцтва Гаваса, супроць ураду Тард'е галасавалі ўсе камуністы, сацыялісты і радыкалы. Міністр фінансаў сказаў прадстаўніком друку наконт адстаўкі габінэту, што ён дзейнічаў у поўнай згодзе з Тард'е.

* * *

ПАРЫЖ, 18-2 Буржуазны друк вельмі занепакоен вынікамі францускага ўрадавага крызісу на ход марской канфэрэнцыі. Карэспандэнцыі з Лёндану Заўэрвэйна (супрацоўнік „Ма[illegible] зрабіла на канфэрэнцыі ўражаньне выбуху бомбы. Дэлегаты іншых дзяржаў ня могуць зразумець, як у такі адказны момант урад ідзе ў адстаўку з-за парляманцкіх інтрыг, у якіх удзельнічае частка большасьці, што да гэтага часу падтрымлівае ўрад.

* * *

ПАРЫЖ, 18-II. У сувязі з адстаўкай францускага габінэту праца лёндансгай марской канфэрэнцыі спынена.

Супярэчнасьці капіталізму ВЫРАСТАЮЦЬ У БАРЫКАДНЫЯ БАІ

Баявыя дэманстрацыі беспрацоўных і фабрычнага пралетарыяту, Паліцыя, войска і сацыял-фашысты—на прыдушэньне рэвалюцыйнага руху

Барыкадныя баі ў Мадрыдзе

Рабочыя штурмавалі палац караля. Арганізаваны атрады рабочай самаабароны

БЭРЛІН. 17-II. Як паведамляе „Ротэ Фанэ", у Мадрыдзе і іншых гарадох Гішпаніі 14-га лютага ў сувязі з дэманстрацыямі беспрацоўных адбываліся сур'ёзныя вулічныя баі. Не зважаючы на забарону дэманстрацый, у Мадрыдзе дэманстравалі тысячы беспрацоўных.

Дэманстранты штурмавалі шэраг фабрык, прычым рабочыя гэтых фабрык кідалі працу і далучаліся да беспрацоўных. Урад абвясьціў у МАДРЫДЗЕ СТАН АБЛОГІ.

Усе стратэгічныя пункты, грамадзкія памяшканьні і вулічныя скрыжаваньні былі заняты войскам, узброеным кулямётамі і ручнымі гранатамі. Шмат дзе дэманстранты прарвалі паліцэйскую варту. З выгукамі „працы і хлеба" тысячы дэманстрантаў накіраваліся да каралеўскага палацу з чырвонымі сьцягамі. Тут ДЭМАНСТРАНТЫ таксама ПРАРВАЛІ ВАЙСКОВУЮ ВАРТУ. На спробы дэманстрантаў штурмаваць палац ВАРТА АДКАЗАЛА КУЛЯМЁТНЫМ АГНЁМ.

Адступіўшы спачатку, ДЭМАНСТРАНТЫ АДНАВІЛІ ШТУРМАВАНЬНЕ ПАЛАЦУ. Былі ПАБУДАВАНЫ БАРЫКАДЫ, пад прыкрыцьцём якіх дэманстранты абараняліся каменьнямі і ўсім, чым папала. Баі прадаўжаліся да позьняй ночы. Паранена шмат рабочых. 20 паліцэйскіх цяжка паранена.

У рабочых кварталах Мадрыду таксама ІШЛІ БАРЫКАДНЫЯ БОЙКІ, якія на спыналіся аж да раніцы.

Паведамляюць таксама пра суровыя БОЙКІ Ў ПРАВІНЦЫЙНЫХ ГАРАДОХ. У Барселёне беспрацоўныя наладзілі галодны паход і ШТУРМАВАЛІ ПАМЯШКАНЬНЕ МУНІЦЫПАЛІТЭТУ І ПАЛІЦЭЙСКАЙ УПРАВЫ. Зруйнавана шмат харчовых крам.

У Сагунта рабочыя чыгуначных майстэрняў абвясьцілі ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЗАБАСТОЎКУ, патрабуючы павялічыць заработак і скараціць рабочы дзень. У горадзе ўведзен стан аблогі. Забастовачны камітэт арыштован, а сход баставаўшых рабочых разогнан паліцыяй, якая пусьціла пры гэтым у ход гумовыя палкі.

Настрой рабочых надзвычайна ўзьняты. 15-га лютага ўчынен наскок на паліцэйскую варту ў некалькіх мясцох і вызвалена некалькі арыштаваных. Ад раніцы ідзе суровая вулічная бойка. БОЛЬШАСЬЦЬ РАБОЧЫХ УЗБРОЕНА. АРГАНІЗАВАНЫ АТРАД РАБОЧАЙ САМААБАРОНЫ ДЛЯ АХОВЫ ЎСІХ СХОДАЎ І ДЭМАНСТРАЦЫЙ. У Толеда таксама здарыліся суровыя баі паміж дэманстраваўшымі беспрацоўнымі і паліцэйскімі.

Напад паліцыі на дом кампартыі Нямеччыны

БЭРЛІН, 18-2. Сёньня вялікія атрады паліцыі абкружылі дом імя Кэрла Лібкнэхта, у якім знаходзіцца ЦК нямецкай кампартыі, бэрлінскі камітэт КП і нямецкага камсамолу, рэдакцыя „Ротэ Фанэ" і КПВОВ. Усе ходы былі заняты паліцыяй і ўчынен вобыск ва ўсім памяшканьні. Вобыск учынен па загаду дзяржаўнага суду з мэтаю выкрыць доказы па справе аб так званых „разлагаючых брашурах".

Рабочыя ў абарону кампартыі

БЭРЛІН, 18-2. Вобыск, учынены сёньня шматлікім атрадам паліцыі ў доме імя Карла Лібкнэхта, цягнуўся каля трох гадзін. Шмат супрацоўнікаў было абшукана асабіста. Вестка пра захоп дому імя Карла Лібкнэхта паліцыяй маланкай абляцела па рабочых кварталах Бэрліну. Хутка перад домам сабраўся вялікі натоўп рабочых, якія гучна выказвалі абурэньне вобыскам. Пры выхадзе паліцыі рабочыя дэманстравалі выгукамі баявога прывітаньня забароненага саюзу Чырвоных франтавікоў.

Паліцыя некалькі разоў нападала на пратэставаўшых, пушчаючы ў ход гумовыя кіі.

Было дадзена некалькі залпаў. Аднак рабочыя ізноў і ізноў зьбіраліся на дэманстрацыі пратэсту. Паліцыя ўчыніла шматлікія арышты сярод дэманстрантаў.

Сацыялісты мяркуюць пагрэць лапы

ПАРЫЖ, 18-2. Сацыялістычная фракцыя палаты прыняла аднагодна кампрамісную згоду па пытаньні аб урадавым крызісе. Формула гэта, з аднаго боку, ня мае непасрэднай супярэчнасьці пастанове пядаўнага зьезду сацыялістычнай партыі, які выказаўся, як вядома, супроць удзелу сацыялістаў ва ўрадзе, а з другога—формула не паказвае і выразнай адмовы сацыялістаў ад удзелу ў якасьці меншасьці ў „левым" урадзе.

Правая большасьць сацыялістычнай фракцыі імкнецца да таго, каб штурхнуць фракцыю па гэтым іменна шляху.

Прынятая фармулёўка кажа: „Сацыялістычная фракцыя, адзначаючы, што вотум недавер'я адносіцца да ўсяго рэакцыйнага ўраду Тард'е цалкам (гэта намёк на тое, што крызіс не павінен быць вычарпаны зьменаю асобных міністраў, у прыватнасьці міністра фінансаў Шэрона, а выклікаць канчатковую адстаўку Тард'е), падцьвярджае, што сацыялісты пры ўсякіх абставінах заўсёды гатовы ўзяць на сябе адказнасьць за ўладу (інакш кажучы, стаць на чале ўраду) і заяўляе, што, у выпадку неажыцьцяўленьня гэтай пэрспэктывы, сацыялістычная фракцыя гатова падтрымаюць урад, пастаўлены радыкальнай партыяй, падтрымліваючы разам з левай большасьцю праграму рэформ і міру".

Працяг тэлеграм глядзі на 2-ой стар.

Па Савецкаму Саюзу

ПЛЯНЫ КАНТРАКТАЦЫІ ЖЫВЁЛЫ ПА БССР НЯ ВЫКАНАНЫ

МАСКВА, 18. Сёньня вечарам на пасяджэньні калегіі Наркамзему СССР павінны былі быць заслуханы даклады наркамземаў БССР і УССР аб мерах, прынятых імі па кантрактацыі жывёлы, у выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб вырашэньні мясной праблемы.

Старшыня т. Грынько агаласіў наступную тэлеграму, якая атрымана сёньня ад наркамзему Беларусі т. Рачыцкага. „Даклад 18 лютага па кантрактацыі жывёлы прашу зьняць. Плян выкананьня кантрактацыі ўсімі арганізацыямі ў студзені і лютым правалены. У сувязі з суцэльнай калектывізацыяй я даручыў распрацоўку гэтае справы на новых прынцыпах".

Прадстаўнік НКЗ Беларусі т. Ляховіч, які прысутнічаў на пасяджэньні калегіі НКЗ СССР, прасіў зьняць даклад Беларусі, матывуючы тым, што кантрактацыяй жывёлы ў БССР займаецца галоўным чынам Наркамгандаль, а не Наркамзем. Тэлеграма т. Рачыцкага і заява т. Ляховіча выклікалі на пасяджэньні вялікае зьдзіўленьне. Тав. Грынько запрапанаваў прадстаўніку НКЗБ т. Ляховічу ўсё-ж зрабіць невялікае інфармацыйнае паведамленьне аб становішчы гэтага пытаньня ў БССР.

Заслухаўшы паведамленьне тав. Ляховіча, калегія НКЗ СССР пастанавіла: „Канстатаваць, як прызнае і сам Наркамзем БССР, што плян кантрактацыі жывёлы ў студзені і лютым правалены, што зьяўляецца грубейшым парушэньнем дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ўраду аб павялічэньні таварнага і мясного пагалоўя. Абвясьціць суровую вымову Наркамзему БССР за недапушчальныя аднос ны да выкананьня праграмы кантрактацыі".

КОЛГАСЫ ПАВІННЫ АРГАНІЗАВАЦЬ АДХОДНІЦТВА

МАСКВА. За подпісам сябра праўленьня Калгасцэнтру СССР т. Чарнецкага паслана тэлеграма ўсім рэспубліканскім і краёвым калгасным арганізацыям аб пашырэньні адходніцтва ў калгасах.

Сёлета для сэзонных работ у прамысловасьці калгасы павінны арганізаваным парадкам вылучыць паўтары мільёны адходнікаў. На аснове генэральнай згоды Калгасцэнтру СССР і НК Працы калгасная сыстэма павінна заключыць дагавор з мясцовымі аддзеламі працы аб вылучэньні на сэзонную працу ўсёй вольнай рабочай сілы ўнутры калгасаў.

Арганізацыя адходніцтва зьяўляецца ўдарнай палітычнай задачай.

Савецкія машыны здалі экзамен

УЛАДЗІМІР, 18-II. На гуце пушчана 10 новых машын Фурко, з якіх 8 зроблена на савецкіх заводах, а 2 прывезены з Бэльгіі. Спроба паказала, што савецкія машыны ня горшыя за бэльгійскія. Новыя машыны будуць штогоду даваць, пры ранейшай колькасьці рабочых, 10 тысяч тонн вконнага шкла.

2500 трактараў выпусьціў „Красный Путиловец"

ЛЕНІНГРАД. 18-II. Праграма «Красного Путиловца» па трактарабудаўніцтву на сакавік устаноўлена ў 750 трактараў. Ад пачатку бягучага году „Красный Путиловец" выпусьціў 2150 трактараў, прычым заданьне за студзень было скончана ў першай палове лютага.

Знойдзен труп амэрыканскага лётніка

МАСКВА. Старшыня арктычнай камісіі тав. Каменеў атрымаў радыёграму са «Стаўропаля» наступнага зьместу: „13-га лютага ўвечары знойдзен труп борт-мэханіка Борлявда. Росшукі прадаўжаюцца. Аляксееў, Кучноў і Сьляпнёў".

Прычыны выбуху на капальні імя Маркса

МАСКВА, 16-II. У Маскву вярнулася ўрадавая камісія, пасланая на рассьледаваньне прычын выбуху на капальні імя Маркса ў Данбасе.

Камісія ўстанавіла, што выбух грамучага газу здарыўся пры праводцы вэнтыляцыі. Уся праца па праводцы вэнтыляцыі праводзілася тэхнічна неабдумана.

Азіміна вышла добра з-пад сьнегу

РАСТОЎ-ДОН, 17-II. На ўсім краі выпаў сьнег, пераважна на поўначы. Хоць азіміна да гэтага ўжо вышла з-пад сьнегу, але новы сьнег і маразы яе не папсавалі.

МІЖНАРОДНЫ АГЛЯД

Мы ўжо маем магчымасьць канстатаваць, што Савецкі Саюз уступіў у пэрыяд, калі варожасьць капіталістычнага сьвету супроць дзяржавы пралетарскай дыктатуры ўзмацняецца з кожным днём. Мы маем справу ня толькі з выбухам чарговай хвалі антысавецкай кампаніі, што ня раз здаравася ў мінулым, а з плянавым сыстэматычным дзеяньнем антысавецкіх сіл, якія праводзяць сваю акцыю з вялікім размахам і ў шэрагу краін.

Пасьля апраўданьня ў Парыжы зграі машэньнікаў, якія падрабілі вэксалі нашага гандлёвага прадстаўніцтва, бэрлінскі суд рашыў паказаць, што „ёсьць яшчэ судзьдзі ў Бэрліне" і што яны таксама ўмеюць ухваляць антысавецкія прыгаворы. Бэрлінскі суд вызваліў па амністыі як „палітычных злачынцаў" авантурнікаў, якія займаліся вырабам фальшывых чырвонцаў. Нават частка буржуазнай нямецкай прэсы прымушана была назваць гэты прыгавар „дзіўным" і „незразумелым". Дзіўнага і незразумелага тут аднак, мала. Бэрлінскі прыгавор зьяўляецца яркаю сьведкаю росту антысавецкіх тэндэнцый сярод нямецкай буржуазеі.

Адначасна з працэсам фальшываманэтчыкаў у Нямеччыне разьвіваецца шалёная кампанія ў друку супроць Савецкага Саюзу і савецкіх установаў. У гэтай кампаніі, апроч сацыял-фашыстаў, якія, як заўсёды, іграюць першую скрыпку ў антысавецкім хоры, і груповак, здаўна вядомых сваёй варожасьцю да Савецкага Саюзу, прымаюць удзел тыя партыі нямецкай буржуазеі і тыя органы друку, якія да гэтага часу разумелі ўсю важнасьць для Нямеччыны захаваньня нармальных і прыяцельскіх адносін з Савецкім Саюзам.

Нарэшце, самым апошнім фактам у ланцугу антысавецкіх выступленьняў зьяўляецца вобыск, учынены нямецкай паліцыяй у мюнхенскім аддзяленьні нашага гандлёвага прадстаўніцтва. Усё гэта прымушае савецкую грамадзкасьць паставіць ва ўсёй шырыні пытаньне аб далейшых пэрспэктывах савецка-нямецкіх адносін.

Мы ніколі ня цешылі сябе ілюзіямі наконт таго, якою будзе канчатковая пазіцыя нямецкай буржуазеі ў часе надыходзячых боек паміж пераможнай пралетарскай рэвалюцыяй і капіталістычным сьветам. Але мы ўлічвалі, што Нямеччына, якая нясе на сабе цяжар Вэрсальскага міру, блізка зацікаўлена ў захаваньні тых адносін з СССР, якія вядомы пад назваю „палітыкі Рапало".

Гаагская канфэрэнцыя павінна была паказаць нямецкай буржуазіі, што Вэрсальскі дагавор усё яшчэ дзейнічае і цяжар прайгранай вайны яшчэ вісіць над Нямеччынай. Не зважаючы на гэта, частка нямецкай буржуазеі, як відаць, стараецца заслужыць палегчаньне свайго становішча, прапануючы свае паслугі тварцом Вэрсальскага дагавору дзеля ўдзелу ў антысавецкім блёку. Калі гэтыя ідэі стануць пераважаючымі ў нямецкіх кіруючых колах, дык нам давядзецца, бясспрэчна, зрабіць адпаведныя вывады.

Але найбольшага напружаньня антысавецкая кампанія дасягнула ў Францыі. Зьнікненьне белагвардзейскага генэрала Куцепава дало прычыну для нячуванага бясприкладнага цкаваньня як Савецкага Саюзу, так і нашага паўнамоцнага прадстаўніцтва ў Парыжы. Распаясаныя белагвардзейцы наладжваюць дэманстрацыі перад паўнамоцным прадстаўніцтвам пры маўклівай згодзе францускай паліцыі, а абнагаелая прадажная прэса выступае з шэрагам інсінуацый, патрабуючы разрыву адносін паміж Францыяй і СССР. Францускі ўрад ва ўсёй гэтай гісторыі займае вельмі двусэнсую пазіцыю. Ня ўжываючы ніякіх афіцыйных захадаў, ён адначасна ня толькі ня робіць нічога, каб спыніць гэтае ганебнае цкаваньне, несумясьцімае з нармальнымі адносінамі паміж Францыяй і СССР, але нават не палякапоціца аб тым, каб адмежавацца ад усіх гэтых няпрыстойных выступленьняў.

У апошні час быў выдуманы яшчэ адзін спосаб антысавецкіх выступленьняў. Гэта—выступленьні пратэсту супроць, нібыта, маючых месца ў Савецкім Саюзе рэлігійных прасьледаваньняў. Магутны рух шырокіх мас нашага Саюзу супроць рэлігіі за зачыненьне цэркваў і барацьбу з рэлігійным дурманам паказваецца і расьпісваецца капіталістычнай прэсай, як прасьледаваньне рэлігіі адміністрацыйнымі захадамі. Кіруючыя колы буржуазеі стараюцца выкарыстаць усе плёткі аб прасьледаваньні рэлігіі, бо яны спадзяюцца прыцягнуць такім шляхам да барацьбы супроць СССР ня толькі багатыя клясы, але і найбольш цёмныя несьвядомыя гушчы працоўных.

Першыя „пратэсты" супроць прасьледаваньня рэлігіі мелі месца ў Англіі. Ангельская буржуазея, як вядома, заўсёды была вядома сваім ханжаством і няшчырасьцю. Але потым, як па указцы, гэтыя пратэсты пачалі выносіцца і ў іншых краінах: у Францыі, Нямеччыне, Фінляндыі. Асабліва ўзмацніліся выступленьні над сьцягам абароны рэлігіі, калі наконт гэтага выказаўся такі „аўтарытэт" як сам папа рымскі. Жадаючы зарабіць на гэтым палітычны капітал і дамагчыся ажыцьцяўленьня заветнай мары—падначаленьня праваслаўнай царквы, папа ў лісьце да аднаго з кардыналаў „скорбіт" наконт рэпрэсій, якія дерпіць, нібыта, царква ў Савецкім Саюзе. Вядомая рэч, гэтая новая зброя барацьбы з СССР зьяўляецца зусім няпрыгоднаю. Але буржуазея ня можа не паспрабаваць выкарыстаць і яе.

Крыклівыя выступленьні ў сувязі са зьнікненьнем Куцепава, у „абарону рэлігіі", цкаваньне супроць нашых паўнамоцных прадстаўнікоў, абвінавачаньні ў камуністычнай прапагандзе—усё гэта зьяўляецца нечым інакшым, як спробай мабілізацыі ўсіх антысавецкіх сіл, падрыхтоўкай настрояў для больш актыўных выступленьняў капіталістычнага сьвету супроць Савецкага Саюзу. Такі факт, як рашэньне мэксіканскага ўраду парваць адносіны з СССР, паказвае ў якім напрамку працуюць варожыя нам імпэрыялістычныя групоўкі. Пад шумок антысавецкай прапаганды ваенныя падрыхтоўкі супроць СССР прадаўжаюцца шалёным тэмпам.

У сувязі з новымі спробамі заснаваньня антысавецкага блёку вельмі характэрным зьяўляецца адказ францускага прэмера Тард'е на запытаньне аб тым, ці не намеран францускі ўрад парваць зносіны з Савецкім Саюзам, Тард'е адказаў, што пытаньне аб барацьбе з бальшавізмам можа быць вырашана не аднэй Францыяй, а толькі ў эўрапейскім або нават у сусьветным абхваце. Няўдача лёндансгай марской канфэрэнцыі, якая агольвае перад шырокімі масамі ўсяго сьвету ўсю фальшывасьць пацыфісцкіх дэкларацый імпэрыялістаў наконт іх гатоўнасьці разброіцца, выклікае ў іх жаданьне апраўдаць свае ўзброеныя спасылкай на „камуністычную небясьпеку".

Вельмі інтэнсыўная работа ў напрамку стварэньня антысавецкага фронту адбываецца і ў суседніх з намі краінах. Даволі зазначыць на апошні візыт эстонскага прэзыдэнта Штрандмана ў Варшаву. Прадстаўнік эстонскай ваеншчыны генэрал Ляйдонэр непасрэдна заявіў наконт гэтага падарожжа, што Польшча і Эстонія павінны дамовіцца наконт ваеннага супрацоўніцтва. „Аб гэтым дагаварваюцца, падаў Ляйдонэр, ужо ў мірны час, а не тагды, калі вайна распачалася".

Такім чынам, усё вышэйпададзенае дае нам магчымасьць канстатаваць бясспрэчнае абвастрэньне міжнароднага становішча, рост варожасьці ў адносінах да СССР з боку капіталістычнага сьвету, узмацненьне ваенных падрыхтовак і працы над арганізацыяй антысавецкага фронту. Усё гэта прымушае нас быць больш пільнымі і ўважлівы сачыць за нашымі ворагамі.

Мы можам зусім спакойна чакаць далейшага разьвіцьця падзей.

Чым тлумачыцца рост антысавецкіх настрояў? Бясспрэчна, у першую чаргу нашымі гаспадарчымі і палітычнымі посьпехамі. Буржуазея пачынае разумець, што ажыцьцяўленьне пяцігодкі, правядзеньне пляну калектывізацыі сельскай гаспадаркі, ліквідацыя кулацтва як клясы—усё гэта надае Савецкаму Саюзу ня чуваную магутнасьць і зробіць зусім безнадзейнымі ўсе спробы ўзброеным парадкам раздушыць нашу сацыялістычную краіну. З гэтае прычыны яны імкнуцца на даць нам узмацніцца і хочуць паспрабаваць сарваць нашы вялізарныя работы па рэканструкцыі нашай гаспадаркі і пабудове сацыялізму.

Разам з тым нашы посьпехі зьяўляюцца вялізарнымі рэвалюцыянізуючымі фактар

Праверыць выкананьне

Сёньня апошні дзень вызначанага тэрміну засыпкі насеньных фондаў

ПАТРАБАВАЦЬ АДКАЗНАСЬЦІ АД КОЖНАГА ЗА СВОЙ ВУЧАСТАК; СУРОВА КАРАЦЬ ЛЕЖАБОКАЎ І РАЗГІЛЬДЗЯЕЎ

НА ЧОРНУЮ ДОШКУ: Рагачэўскі, Горацкі, Калінкавіцкі і Лельчыцкі раёны, якія да гэтага часу адстаюць у справе абагуленьня насеньня

РАЎНЯЙЦЕСЯ ПА ЛЕПШЫХ: Юравіцкім, Тураўскім, Капаткевіцкім і Клімаўскім раёнах, якія поўнасьцю і ў тэрмін выканалі дырэктыву партыі і ўраду

Ні на хвіліну паслабленьня! З бальшавіцкай настойлівасьцю і энэргіяй фарсаваць стварэньне насенфондаў

Дырэктыву ўраду выканалі ў тэрмін

(Мсьціслаўскі р., Аршаншчына)

У Янаўскім с.-с. на 15-2 поўнасьцю абагулена і ссыпана насеньне. Абагулены ўсе коні, каровы і авечкі. Абагульваюцца сьвіньні. Усе хлявы ў парадку.

Ва ўсёй рабоце па падрыхтоўцы да сяўбы значную ролю адрыгрываюць створаныя ўдарныя брыгады. Па арганізацыі працы і сродкаў вытворчасьці калгасьнікі скарыстоўваюць вопыт старой камуны „Шлях Селяніна".

У сельсавеце поўнасьцю праведзена раскулачваньне. Уся маемасьць кулакоў перададзена ў калгас, у частцы кулацкіх хат жыве беднота, а ў частцы арганізаваны клюбы, школы, дзіцячыя сады і сталоўкі. Раскулачваньне праведзена арганізаваным парадкам і пры актыўным удзеле батрацка-бядняцкіх мас.

Ц. Ф.

Прыклад адсталым раёнам

(Мазырская акруга)

У большасьці раёнаў насеньне створаны. Асабліва дрэнна справа ў гэтых адносінах у Лельчыцкім раёне, дзе заданьне выканана толькі на 10 проц., і ў Калінкавіцкім—17 проц.

Тлумачыць „аб'ектыўнымі" прычынамі гэтакую маруднасьць ні ў якім **насьці" зьяўляецца Юравіцкі, Тураўскі і Капаткевіцкі раёны: у першым заданьне выканана на 113 проц., у другім—на 102 проц. і ў трэцім—100 проц.**

Г.

За зрыў—да суровай адказнасьці

(Магілеўшчына)

Чэрыкаўскі раён на 15 лютага выканаў заданьне па абагульваньні насеньня на 98 проц.

Клімавіцкі раён па насеньні выканаў заданьне на 92 проц. Коні абагулены на 100 проц.

Гэткае-ж становішча і ў Лупалаўскім раёне. У акрэ заслухана справаздача раённых упаўнаважаных насеўкампаніі. Узьнята пытаньне аб прыцягненьні да адказнасьці прэзыдыумаў Магілеўскага і Лупалаўскага райвыканкомаў за бязьдзейнасьць.

Няма баявых тэмпаў

(Горкі, Аршаншчына)

Горацкі раён да сяўбы павінен быць калектывізаваны поўнасьцю.

На сёньнешні дзень калектывізавана больш як на 75 проц. Паасобныя сельсаветы калектывізаваны ўжо поўнасьцю, арганізавана 50 калгасаў на плошчы 29499 га. Пляны новай насеўкампаніі даведзены да кожнага калгасу, але на сёньнешні дзень не наглядаецца баявых тэмпаў у выкананьні гэтых плянаў.

Тэрміны па абагульваньню насеньня ўжо канчаюцца, а па раёну насеньне абагулена толькі на 50 проц.

Яшчэ горш справа з ачысткай насеньня. Ачышчана каля 20 проц. заданьня.

Прадукцыйная і рабочая жывёла абагулены на 8 проц., што сьведчыць аб няўважлівых адносінах да гэтай справы.

Плянам прадугледжана завезьці ў раён 2139 цэнтн. гатункованага насеньня, але гэта лічба выкананa на 18 проц. Райкалгасаюзу трэба найхутчэй пакланапіцца, каб завесьці патрэбнае насеньне.

З студэнтаў і навуковых працаўнікоў сельска-гаспадарчай Акадэміі складзены ўдарныя брыгады па дапамозе ў падрыхтоўчай рабоце да сяўбы. Штаб калектывізацыі, які створан пры Акадэміі, ня стаў яшчэ тварам да калгасаў. Кіраўніцтва брыгадамі адсутнічае, брыгадзіры вельмі часта зьбіраюць толькі весткі па раёну, а не дапамагаюць [illegible] рабоце.

Вясною олізкі. Трэба дамагчыся баявых тэмпаў у падрыхтоўцы да сяўбы.

М.

Як ня трэба весьці падрыхтоўку

(Прыпойскі р., Магілеўшчына)

Хутка падыходзіць сяўба, але тэмпы падрыхтоўкі да яе зьяўляюцца рабскімі, на вартымі нашай сучаснасьці і пагражаюць зрывам правядзеньня гэтай важнай гаспадарча-палітычнай кампаніі, асабліва ў раёнах суцэльнай калектывізацыі.

Да такіх раёнаў можна цалкам аднесьці Прапойскі раён. І да гэтага часу назіраюцца марудныя тэмпы ачысткі насеньня, абагульваньня рабочай і прадукцыйнай жывёлы, інвэнтару, насеньня і інш. На 1-II—30 г. ачышчана насеньня 27,19 проц. агульнага плянавага заданьня; абагулена насеньня 9,92 проц., рабочай і прадукцыйнай жывёлы 1,45 проц., да абсталяваньня майстэрняў і кузьняў для рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару амаль ня прыступлена; няма ў наяўнасьці патрэбнага для рамонту інвэнтару сартавога жалеза, справа па кантрактацыі яшчэ знаходзіцца ў стадыі плянаваньня, але тут трэба адзначыць, што заданьні і наказаньні па гэтаму пытаньню атрыманы з акруг толькі 1-II г. г.; работа па распаўсюджваньню трактарных абавязацельстваў і акцый трактара цэнтру яшчэ не распачата.

Асабліва нядбайныя адносіны ў гэтым праяўляюць сельсаветы, КСТУ і каапэрацыйныя арганізацыі. Нават ёсьць сельсаветы, у якіх яшчэ амаль нічога ня зроблена ў справе падрыхтоўкі да вясновае сяўбы (Цяляшоўскі, Гіжэнскі, Івацінчавіцкі, Васькаўскі і Чарнякоўскі). Спажывецкая каапэрацыя яшчэ да 1 лютага ўсё спрачалася з сельска-гаспадарчым крэдытным т-вам па пытаньню перадачы загатоўленых ёю яравых культур і іх ачысткі для насеньня.

Такое становішча падрыхтоўкі да вясновае сяўбы патрабуе ад раённых устаноў неадкладнага прыняцьця практычных захадаў да насіленьня гэтае работы. Сацспабарніцтва, абмен вопытам і праверка ходу падрыхтоўкі да сяўбы, як мэтад, павінен быць выкарыстаны ва ўсю шырыню.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі, рабочыя брыгады і рабочыя, якія прыбылі на сталую работу ў калгасы, павінны стаць на чале арганізацыі шырокіх колаў батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі вакол падрыхтоўкі да вясновай сяўбы і праверкі ходу гэтае работы. Павінна быць шырока разгорнута крытыка і самакрытыка.

М. П.

Падрыхтоўка самацёкам

(Рагачоўскі раён, Бабруйшчына)

Абагульваньне жывога і мёртвага інвэнтару ў раёне ідзе вельмі павольна. **Справа з абагульваньнем насеньня і сельска-гаспадарчага інвэнтару зрушылася з месца, але пералому няма.**

Ачыстка насеньня таксама не наладжана як сьлед. Ёсьць факты, калі дрэннае і добрае насеньне пры ачыстцы зьмешваюцца.

Я. К.

Праца на кулака

(Капыльскі раён, Меншчына)

Ня гледзячы на тое, што падрыхтоўка да сяўбы ў поўным разгары, Пацткаўскі сельсавет сьпіць.

Напрыклад, сэкратар сельсавету гр-н Пасынкоўскі, у той час, калі ўсе сілы сельсавету мабілізаваны на гаспадарчы фронт, ён па некалькі дзён не зьяўляецца нават у памяшканьне сельсавету.

Складаньне пляну пасеўкампаніі, дача вестак аб ходзе—гэта да яго не датычыцца. Запест уделу ў падрыхтоўцы да сяўбы, кожны дзень п'янствуе.

Ад такой работы маюцца недапушчальныя вынікі. Няма своечасовага рэагаваньня да кулакоў, якія зьнішчаюць жывёлу.

Вось факты, аб якіх сёньня ні ў якім разе нельга маўчаць.

Алесь Вядомы.

Буржуазны друк заклікае да нападу на СССР

Інтэрв'ю карэспандэнта чужаземнага друку у Маскве з галавой праваслаўнай царквы ў СССР мітрапалітам Сергіем

МАСКВА, 18-II. Вы пытаеце, на якой падставе мы лічым папу ворагам праваслаўя. Як-жа нам думаць інакш, калі каталіцкая царква, на чале якой стаіць папа, за адзін толькі 1929 год гвалтоўна адабрала ад праваслаўных прыхажан каля 500 праваслаўных цэркваў, абярнуўшы іх у каталіцкія касьцёлы. Нам невядома, каб якія-небудзь біскупы ў Англіі, Амэрыцы ці іншай краіне выступілі супроць гэтых гвалтоўных учынкаў каталіцкае царквы.

Вы пытаеце, ці ёсьць у нас якія-небудзь доказы таго, што выступленьні [illegible] цыпіскупа Кентэрбэрыйскага і іншых галоў царквы, якія далучаюць свой голас да заклікаў аб крыжавым паходзе, маюць на мэце пашкодзіць савецкай дзяржаве як у межах СССР, так і заграніцаю. Мы лічым дзіўным гэтае запытаньне з боку прадстаўнікоў чужаземнага друку. Вы ня можаце ня ведаць, што **чужаземны друк перапоўнен у гэтыя дні самымі драпежнымі несправядлівымі** і нявартымі хрыстыяніна **нападамі на СССР і заклікамі да варожых супроць яго дзеяньняў.**

Запытаньне: Якія вашы адносіны да адміністрацыйных захадаў, ужытых супроць праваслаўнай царквы, як забарона званіць у Маскве, скасаваньне нядзелі і іншых царкоўных сьвят?

Адказ: Вам, чужаземцам, мабыць, вядома, што ў некаторых краінах даўно ўжо абмежаван законам звон, а ёсьць выпадкі нават поўнае забароны яго. [illegible] СССР звон адмяняецца па жаданьні працоўнага насельніцтва. Мы ня бачым у гэтым нічога, што ганьбіла-б нашу рэлігію. Што датычыць рэлігійнага сьвята, дык савецкая ўлада, не сьвяткуючы яго ў дзяржаўных і грамадзкіх установах, зусім не перашкаджае сьвяткаваць іх царкве, і мы, сьвяткуючы іх, ня можам паскардзіцца на адсутнасьць народу, які прыходзіць маліцца.

ПРАЦЯГ ДОПЫТУ „РАБОЧАГА" УРАДУ АБ АНГЛА-САВЕЦКІХ АДНОСІНАХ

ЛЁНДАН, 18-II. Англа-савецкія адносіны прадаўжаюць заставацца ў цэнтры ўвагі апошніх пасяджэньняў палаты вобшчын. Гэндэрсону, міністру фінансаў і таварышу міністра гандлю Джылету было зададзена шэраг запытаньняў. У адказе на запытаньне, ці атрымала міністэрства замежных спраў якія-небудзь скаргі ад ангельскіх паданых, якія жывуць у СССР, што ім перашкаджаюць выконваць рэлігійныя звычаі, тав. міністра замежных спраў Дальтон паведаміў, што такіх скаргаў не атрымана.

Міністру фанансаў было дадзена запытаньне, колькі грошай вернута ў 1929 годзе з усіх вылучаных сродкаў, якія былі патрачаны на матар'ялы і галавы прылады, перададзеныя Калчаку, Дзянікіну, Юдзенічу і іншым белагвардзейскім лідэрам.

Тав. міністра фінансаў адказаў, што ў лік гэтых сум нічога ня было атрымана і ў сучасны момант няма ніякай надзеі на атрыманьне якіх-небудзь узносаў.

Дэпутат рабочай партыі Гэйкон запытаў: „Ці азначае гэта, што Англія страціла больш за 100 міліёнаў фунтаў стэрлінгаў, падтрымліваючы групу контр-рэвалюцыянэраў?". На гэтае запытаньне адказу ня было дадзена.

Канцэрватар Вільямс запытаў Гэндэрсона, ці ўжывае ён захады да выкананьня перадвыбарчых абяцаньняў аб прасоўваньні прадукцыі ангельскай прамысловасьці ў СССР. Гэндэрсон адказаў, што ўрад робіць вельмі многа для гэтага, але ня можа аб гэтым сказаць у сваім адказе.

Дэпутат Сэмюэль запытаў: „Чаму ўрад адмовіў даць палёгкі савецкай дэлегацыі, якія далі-б ёй магчымасьць купіць у Англіі 3 мільёны пар чаравікаў, і ці ведаў урад, што дэлегаты спадзяваліся на такія палёгкі". Джылет адказаў: „Я ня быў асьвядомлен аб актуальнай прапанове, але калі паважаны джэнтэльмэн дасьць мне інфармацыю —дык я яе разгледжу".

* * *

ЛЁНДАН, 17-II. Усе газэты, апроч кансэрватыўнай „Дэйлі Тэлеграф", агалашаюць паведамленьне ТАСС аб інтэрв'ю мітрапаліта Сергія або поўнасьцю, або скарочана.

Амаль што ўсе газэты, апроч лібэральнай „Манчэстэр Гардыян" і „Дэйлі Гэральд" (орган рабочай партыі), падкрэсьліваюць, што да інтэрв'ю належыць адносіцца з недавер'ем, паколькі яно распаўсюджваецца афіцыйным агенцтвам ТАСС, што інтэрв'ю зьяўляецца падробленым.

* * *

ЛЁНДАН, 17-II. Як паведамляе Рэйтэр, кансэрватар Кінгсьлей Вуд запытаў, „ці ўзьнята ўжо перад савецкім паслом пытаньне аб рэлігійных прасьледваньнях у СССР".

Гэндэрсон адказаў: „Раней, чымся ўзьвімаць такое пытаньне, трэба пераканацца ў фактах".

Падрыхтоўка самацёкам

(Рагачоўскі раён, Бабруйшчына)

Абагульваньне жывога і мёртвага інвэнтару ў раёне ідзе вельмі павольна. **Справа з абагульваньнем насеньня і сельска-гаспадарчага інвэнтару зрушылася з месца, але пералому няма.**

Ачыстка насеньня таксама не наладжана як сьлед. Ёсьць факты, калі дрэннае і добрае насеньне пры ачыстцы зьмешваюцца.

Я. К.

ВЫВЕЗЬЦІ ЛЕС

Да скончэньня месячніка вывазкі і загатоўкі лесу засталося пяць дзён

Заданьні па лесавывазцы павінны быць выкананы поўнасьцю.--Тых, хто дапамагае кулаку адхіляцца ад гужпавіннасьці, прыцягнуць да судовай адказнасьці

Узварухнуцца працаўнікам, прыцягнуць кулака на лесазагатоўкі

На Сьвіслацка-Клічаўскім вучастку Лесбелу ў гэтым годзе плян па рубцы выканан на 50 проц., а па вывазу лесу па 25 проц.

Лічбы гаворыць аб тым, што на месячнік лесазагатовак трэба зьвярнуць вялікую ўвагу. Але да апошняга часу аб гэтым не клапоцяцца ні Клічаўскі РВК, ні працаўнікі Лесбелу. У парадку працгужпавіннасьці для работы ў лесе ня прыцягнуты кулацкія гаспадаркі. Ня створана грамадзкая думка вакол пытаньня лесазагатовак і недастатковы ўдзел бядняцка-серадняцкіх пластоў насельніцтва.

Працаўнікі Лесбелу не зварочваюць ніякай увагі правядзеньню лесазагатовак. Яны нават самі шкодзяць лесазагатоўкам. Напрыклад, на Ворлінскім падвучастку старэйшы дзесятнік Цырулькін не выпа[illegible] прадукту беднаце і сераднякам: На Вердскай прыстані прыёмшчык цэлымі днямі ня бывае на прыстані; на Віркоўскім падвучастку як старэйшы, таксама і малодшыя дзесятнікі цэлымі днямі ня бываюць у лесе.

Трэба зараз-жа мабілізаваць партыйныя і камсамольскія сілы для правядзеньня месячніку лесазагатовак, стварыць вакол гэтага пытаньня грамадзкую думку, прыцягнуць шырокія бядняцка - серадняцкія пласты насельніцтва, давесьці плян лесазагатовак да кожнага двара ў паасобку, прыняць рашучыя меры да ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны з боку працаўнікоў Лесбелу.

Трэба вызначыць кулацкім гаспадаркам цьвёрдую лічбу лесазагатовак і сачыць за выкананьнем.

Лукяновіч І. П.

Дробязі, якія перашкаджаюць працаваць

(Пухавіцкі р., Менская акр.)

Лесбел няправільна аплачвае возку: з арцельлю Турынскага с.-с. умаўляецца плаціць за куб. мэтр 3 р. 50 кап., а з арцельлю Кліноцкага с.-с.—4 р. Невядома з якой прычыны гэта робіцца, бо лес аднолькавай пароды і дзялянкі таксама на аднолькавай адлегласьці.

На руме прыёмка ідзе зацяжна: стаіць адзін прыёмшчык і адзін адбойшчык,—даводзіцца доўга чакаць пакуль яны прымуць лес.

На руме рэдка бывае прадстаўнік Лесбелу, які-б паказаў адкуль браць лес. Сяляне вывозяць бярвеньні з адной дзялянкі і ня ведаюць, дзе шукаць другую дзялянку—блудзяць па лесе, трацяць дарма час.

П. Аляксейчык.

Выканалі плян на 98 проц.

(Талочынскі р., Аршаншчына)

Спачатку правядзеньня лесазагатоўчай кампаніі ні раён, ні сельсветы не аддавалі належнай увагі выкананьню пляну лесазагатовак. Цяпер наглядаецца пералом. Цяжар лесазагатовак ляг на кулацкія гаспадаркі. Плян лесазагатовак выканан на 98 проц.

Хадневіч.

Уступілі ў спаборніцтва

(Крупскі раён, Аршаншчына).

Дзьве арцелі возчыкаў вёскі Шынкі і Забалоцьця, Шыкаўскага сельсавету, па пачыну дзесятніка Цірміна, выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва возчыкаў вёсак Скакоўка, Сакаловіцкага сельсавету і Н.-Слабодка, Н.-Слабодзкага сельсавету. Шынкі і Забалоцьце абавязуюцца выканаць плян вывазкі на 100 проц. і ў першую чаргу даставіць экспартны лес да станцыі Слаўнае.

Скакаўцы і Слабодзкане, адказвайце на выклік!

ЛЕСБЕЛАВЕЦ.

Ці не пара прыцягнуць да адказнасьці

(Бягомльшчына, Менскай акругі).

Мсьціжскі вучастак Лесбелу мае пяць падвучасткаў. Павінен загатаваць і вывезьці 75 тысяч кубамэтраў лесаматар'ялу. На 5-II было загатоўлена 65 проц. і вывезена толькі 13 проц. па кожным вучастку.

Лепш праходзіць справа па загатоўцы і вывазцы лесаматар'ялаў на Мсьціжскім падвучастку. Надзвычайна адстае Асаўскі падвучастак—загатоўлена 40 проц. і вывезена 8 проц. [illegible] гота тым, што старшы дзесятнік Хацян працуе купецкімі мэтадамі, а сельсавет і ячэйка зусім у баку.

Асноўнымі тормазамі ў рабоце Мсьціжскага вучастку Лесбелу зьяўляецца: несваечасовы адвод дзялянак 3-й лесасекі з боку адпаведных органаў, бюракратычна-ганебныя адносіны загадчыка Дзяржзапаведніку Гурына да адводу руму для кладкі лесу, які цягнуў гэтую справу больш як месяц.

Ажыятаж на рынку рабочай сілы. Жалязком 3 вучастку плаціў даражэй чым Лесбел. Да гэтага часу няма варбоўшчыка, якога павінен даць Наркампрацы.

Маюцца кулацкія гаспадаркі па 2 і 3 кані і ня прыцягнуты да вывазкі. Калі спадзявацца на самацёк, дык вывазка на Мсьціжскім вучастку будзе сарвана.

Трэба зараз-жа сьцебануць па самацёку і асобах, якія яго дапушчаюць. Выканаць закон аб гужпавіннасьці для кулацкіх гаспадарак.

Д. Верын.

Па-зачарговы пленум Гомельскага АК і АКК

Пленум рашуча асуджае памылкі партыкіраўніцтва арганізацыі

САКРАТАРОМ АК АБРАНЫ ТАВ. ХЛЕЎНІКАЎ. СТАРШЫНЁЮ АКК АБРАНЫ ТАВ. ЗЕЛЯНЬКОЎСКІ

17-га лютага адбыўся па-зачарговы пленум Гомельскага АК і АКК КП(б)Б. Пленум заслухаў і абмеркаваў даклады тав. Калініна і Малаковіча аб пастановах ЦК і ЦКК КП(б)Б па пытаньнях аб становішчы і задачах Гомельскае партарганізацыі.

Па дакладах пленум аднагалосна прыняў пастанову, у якой далучаецца да пастаноў ЦК і ЦКК, рашуча асуджае памылкі партыкіраўніцтва і заклікае ўсе партарганізацыі да рашучага разгортваньня бальшавіцкае самакрытыкі, на аснове дружнага выкананьня баявых задач.

Рэзалюцыя будзе апублікавана ў наступным нумары.

* * *

Пленум пастанавіў задаволіць просьбу тав. Малаковіча аб аслабленьні яго ад абавязкаў сакратара АК.

Сакратаром АК пленум аднагалосна абраў тав. Хлеўнікава.

* * *

18-га лютага на па-зачарговым пленуме АКК КП(б)Б аслаблены ад ад абавязкаў старшыні тав. Земнэн, абраўшы старшынёю АКК т. Зеляньковскага. Сакратаром зацьвердзіць т. Пасюкевіча.

На зьлёце „лёгкай кавалерыі"

Аб чым гаварылі „кавалерысты"

У спрэчках па дакладу т. т. Лазоўскага і Палякова выказалася амаль-што палова ўсяго зьлёту. Выступаючыя ў спрэчках таварышы расказвалі аб рабоце сваіх атрадаў і груп „ЛК" і аб умовах работы. Ня гледзячы на ня зусім спрыяючыя ўмовы разьвіцьця „ЛК" (амаль-што поўная адсутнасьць кіраўніцтва, у выніку чаго—адарванасьць „ЛК" ад штодзённай комсамольскай работы, недастатковая ўвага рабоце „ЛК", нескарыстаньне вынікаў расьледваньняў і г. д.), атрады лёгкай кавалерыі ўсё-ж такі павялічваліся і ўзмацняліся. „Наш атрад за кароткі час, —кажа тав. Шэндрэй (Гомель, ф-ка імя К. Цэткін) узрос з 3 да 100 чалавек", у „ЛК" паступова ўцягваюцца і дарослыя рабочыя:

— „У нашым атрадзе „ЛК" усяго 68 чалавек, з іх 44—дарослых рабочых" (т. Лідленбаум—Гомель, ф-ка „Грудавік").

„ЛК" за параўнальна кароткі тэрмін свайго існаваньня прарабіла шмат карыснай работы, займалася выкрыцьцём розных недахопаў, значна дапамагла больш пасьпяховаму ажыцьцяўленьню нашых плянаў. У Гомелі, напрыклад, кавалерысты выкрылі краязёж струмэнтаў з чыгуначных майстэрняў, у Мазыршчыне — шэраг злачынцаў у каапэрацыі і г. д.

— „Мы правялі сіламі атраду „ЛК" лыжны пробег па вёсках з мэтай растлумачаньня сялянам пасеўнай кампаніі"—кажа дэлегат зьлёту тав. Кабакоў.

— У работу лёгкай кавалерыі ўцягнуліся і дзеці—кажа ў сваім выступленьні пікер Вульскага раёну (Полаччына) тав. Гарбук.

Дэлегаты - кавалерысты скардзяцца на недастатковае кіраўніцтва з боку камсамольскіх ячэек: „Райком прыслаў паперку каб арганізавалі атрад „ЛК", а як гэта зрабіць—нічога не сказаў",—кажа дэлегатка зьлёту тав. Стабіна.

Тое-ж самае наглядаецца і з боку раённых устаноў: „на райзьлёт пасьля шматлікіх запрашэньняў прышлі толькі два адказных райпрацаўнікі дый і тыя увесь час сядзелі як вады ў рот набраўшы, нічога нам не сказалі",—кажа тав. Каплан (Бабруйшчына).

Недахоп у кіраўніцтве прыводзіць да розных скажэньняў работы „ЛК". Кавалерысты часта замяняюць сваю жывую работу фармальнай—складаньнем розных актаў і г. д.

Адзін з атрадаў „ЛК" на Гомельшчыне калі ў клюбе перад спэктаклем не надмялі падлогу—нікому ні слова ня кажучы, склаў аб гэтым акт.

У Мозыры, дзякуючы недастаткова правезенай сярод камсамольцаў растлумачальнай рабоце, апошнія заяўляюць: „якжа мы арганізуем кавалерыю, калі ў нас няма коняй". Недастаткова разгорнута работа „ЛК" на вытворчасьці: у Менску да бюро скаргаў прымацавана каля 50 атрадаў „ЛК", апошнія ня ведаюць што робіцца ў іх на вытворчасьці.

Расьсьледваньнем кавалерыстаў на мясцох аддаюць вельмі мала ўвагі: „Мы падалі ў раённую РСІ 39 спраў аб розных злачынствах і дагэтуль яшчэ ніводнае з гэтых спраў не разгледжана". (тав. Фрыдман, Мазыршчына).

„Мы выкрылі кулака ў каапэрацыі. Шмат куды зьвярталіся, нават у газэту „Магілеўскі Селянін", і нічога ня выходзіць. Заяўлялі таксама і аб разбазараваньні жывёлы, але нам райпрацаўнікі ўсё абяцаюць „разгледзіць". Яны „разглядаюць", а кулак жывёлу разбазарвае". (тав. Цыбулькіна, Магілеўшчына). „У каапэрацыі 109 мэтраў мануфактуры раздалі кулакам і пазбаўленым правоў, і той час калі ільназдатчыкам давалі ўсяго па 1 з паловаю мэтра. Мы выкрылі гэту справу ўжо даўно і падалі аб гэтым матар'ял у Магілеўскі АКК, але справа яшчэ і зараз „расьсьледуецца"—(тав. Фонкац. (Магілеўшчына).

М. П.

Рыхтуемся да XII гадавіны Чырвонай арміі

У Гомелі разгарнулася падрыхтоўка да сьвяткаваньня 12-ай гадавіны Чырвонай арміі.

Рабочыя клюбы рыхтуюць спэцыяльныя пастаноўкі, прысьвечаныя 12-цігодзьдзю Чырвонай арміі, гісторыі Чырвонай арміі, яе гэраічнай барацьбе.

У дні сьвяткаваньня клюбы арганізуюць вечары спатканьня рабочых з чырвоаармейцамі.

Будзе правезены скарбоначны збор на карысьць Чырвонай арміі.

Бібліятэкі папаўняюцца новай літаратурай з жыцьця і гісторыі Чырвонай арміі.

Работа на тармазох

Бабруйскае аддзяленьне Лесбелу ганебна правальвае лесазагатоўкі. Кулацкія сродкі перавозак ня прыцягнуты да вывазкі лесу. Паміж лесазагатоўцамі існуе шалёная канкурэнцыя ў справе вярбоўкі рабочай сілы. Плян вывазкі лесу некаторымі сельсаветамі даводзіцца да кожнага двара без належнай дыфэрэнцыяцыі

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Мы ня будзем заплюшчваць вочы на сапраўднае становішча з забясьпечваньнем камбінату сыравінай. Было-б злачынствам маўчаць зараз і не працягваць будзіраваць пытаньне, якое датычыцца жыцьця такога буйнага прадпрыемства. Калі некалькі дзён таму назад друк паведамляў аб некаторым зруху ў галіне забясьпячэньня камбінату сыравінай, дык апошнія факты прымушаюць зноў падумаць аб лёсе камбінату.

Пагражаючае становішча

Дырэктар камбінату тав. Шклярман некалькі дзён таму на пасяджэньні парткалектыву паведамляў, што камбінат мае запас сыравіны на 4 дні і толькі рэгулярная бесперабойная дастаўка новай здолее выратаваць прадпрыемства ад спыненьня працы.

У гэты-ж дзень на камбінат прыбыў чырвоны абоз з 300 падвод. Апроч гэтага, прыбыло 250 іншых падвод і 31 пляцформа з сыравінай. Гэта некалькі ўзьнядо настрой працаўнікоў камбінату. Аднак, назаўтра лічба гэта рэзка зьнізілася. На камбінат была дастаўлены толькі 31 падвода. Гэта было 15-га лютага, а 16-га да камбінату не падыйшла ніводная падвода, апроч некалькіх пляцформ лесаматар'ялу.

Бабруйскія лесазагатоўцы тлумачаць гэтае рэзкае зьніжэньне двума днямі рэлігійных сьвятаў. Але-ж як быццам ня было, сыравіны для камбінату, такім чынам, засталося толькі на 2 дні. Назаўтра—„па-за сьвятошні дзень"—ста обвіша па першы погляд некалькі палепшылася. Да камбінату было падана 350 падвод і 27 пляцформаў.

Але паколькі можна чакаць шэраг іншых недарэчнасьцяў, становішча з забясьпячэньнем камбінату сыравінай робіцца больш пагражаючым.

„Прыродныя і атмосфэрныя... ўмовы"

Ці здолеюць лесазагатоўчыя арганізацыі Бабруйску справіцца з пастаўленай перад імі задачай: забясьпячэньне камбінату 30 проц. сыравінай (заданьне для Бабруйскай акругі).

Бабруйскі акруговы камітэт партыі 16-га лютага прызнаў, што мясцовы аддзел Лесбелу ня выканаў баявога заданьня па забясьпячэньню камбінату сыравінай.

Мясцовыя загатоўцы спасылаюцца на „аб'ектыўныя ўмовы", прыродныя, атмасфэрныя і інш. агаворкі, каб апраўдаць сваю злачынную нядбайнасьць, каб выратаваць сябе ад нямінучага спагнаньня...

Матар'ял, які мы маем і частку якога мы прыводзім сёньня, сьведчыць аб іншым...

Вялікія магчымасьці, якія былі прадастаўлены Бабруйскім лесазагатоўчым арганізацыям, у сэнсе прыцягненьня кулацкага транспарту,—не скарыстаны. Аб гэтым красамоўна гавораць наступныя факты.

У Асіповічах замест 314 кулацкіх падвод працавала толькі 84.

На Крычаўскім загатоўчым вучастку замест 140 кулацкіх падвод выехала толькі 70.

У Ворлікаўскім вучастку замест 200 кулацкіх падвод выехалі толькі...1 падвода, якая вывазіла блёкі (самая лёгкая работа).

У Бабруйскім вучастку з 220 кулацкіх падвод ніводная не працуе. З мабілізаваных 250 кулацка-нэпманскіх падвод гораду Бабруйску, якія павінны адпрацаваць 70 дзён, вышла толькі 40 і то на 1 дзень.

Не прыцягнулі кулацкі транспарт

Пры выкарыстоўваньні кулацкіх падвод наглядаецца лўнае прымірэнцтва: кулакам даюць для вывазкі лёгкі матар'ял: дровы і блёкі на блізкія адлегласьці.

Характэрны адказ некаторых РВК, сельсаветаў і прарабаў на пытаньне—чаму кулацкія падводы не мабілізаваны. Адказ гэты зводзіцца прыблізна да наступнага:

— Мы кулака ўжо раскулачылі (!?), няма на каго ўскладаць гэтую павінасьць.

З другога боку, дырэктыва аб давядзеньні лесавывазак да кожнага сельсавету і двара, разумеецца некаторымі сельсаветамі прымітыўна і прыводзіць да грубых скажэньняў. У вёсцы Убалоцьце сельсавет разьвярстаў па ўсіх гаспадарках для вывазкі па 80 кубамэтраў кожнаму.

Гэткае давядзеньне да двара, „не зважаючы на асобы і коні", мяжуе са звычайнай падрыўнай работай палітыкі партыі ў вёсцы. Выпадак у в. Убалоцьце не аднолькавы, ён здараецца і ў іншых раёнах.

Побач з гэтым, голад у падводах і ў рубшчыкаў лесу нязвычайны.

У Клічаўскім лесазагатоўчым вучастку замест неабходных 1200 рабочых працуе толькі 160, у В.-Крычаўскім вучастку замест неабходных 8.000 падвод—працуе толькі 4.000, замест 1.500 рубшчыкаў—працуе толькі 500.

Новай рабочай сілы не прыбаўляецца. Комсамол ня здолее затрымаць мабілізаваных камсамольцаў у лесе. З аднаго Бабруйскага вучастку з 150 мабілізаваных камсамольцаў, урачыста накіраваных у лес, бегла 130. У лесе засталіся мясцовыя лесарубы і камсамольцы.

„Хто больш!"

Шалёная канкурэнцыя канчаткова падрывае забясьпечаньне лесазагатоўчых пунктаў рабочай сілай. Прарабы суседніх вучасткаў пераманьваюць рабочых адзін ад другога, павялічваючы цэны. Таму некаторыя рубшчыкі і возчыкі ўходзяць за 30 і больш вёрст ад сваёй вёскі, спакушаючыся „дабратой" прарабаў і вярбоўшчыкаў. Асаблівай гарлівасьцю адрозьніваецца прараб Сьвіслачанскага вучастку. Дзесятнік Мазырскага вучастку едзе ў Гадалавічы, Бабруйскага раёну за рабочай сілай.

Гэткае-ж зьявішча наглядаецца з боку Украінлесу. Існуюць вялікія розьніцы ў цэнах за падводы. Украінлес плаціць 3 р. 50 к. за кубамэтр, а ў Бабруйскай акрузе—1 р. 50 кап. Такое становішча канчаткова падрывае працу суседніх вучасткаў з украінскімі загатоўчымі пунктамі.

Слаба працуюць вярбоўшчыкі рабочай сілы, якія пасланы ў раёны акруговым аддзелам працы. Вельмі часта ў адну і тую-ж вёску прыяжджаюць два вярбоўшчыкі і апроч таго, што яны перашкаджаюць адзін аднаму працаваць, паміж імі пачынаецца адкрытая канкурэнцыя.

У Жлобінскім і Рагачоўскім вучастках, дзе лесу няма, дзе можна было завербаваць рабочую сілу для іншых лесазагатоўчых вучасткаў, ужо некалькі тыдняў працуюць вярбоўшчыкі. Мясцовыя органы апроч паперак, не дапамагаюць вярбоўшчыкам. І з гэтых раёнаў не ўдалося „выкачаць" ніводнага рабочага. Маючы такі рэзэрвуар рабочай сілы ў сябе, у акрузе, мясцовыя райвыканкомы мала што зрабілі, каб дапамагчы ў вярбовачнай рабоце.

Да рэчы, аб дапамозе некаторых РВК у рабоце па правядзеньню лесазагатовак. Бабруйскі РВК даслаў дырэктыву аб месячніку па лесазагатоўках і аб прыцягненьні кулакоў да перавозкі ў сельсаветы толькі... 8-га лютага. Адгэтуль зразумела, з якім тэмпам працуюць нізавыя сельсаветы вакол гэтага месячніку

На шляху правалу лесазагатовак

Мы падалі шэраг фактаў, якія прымушаюць біць трывогу і лічыць, што Бабруйскае аддзяленьне Лесбелу, калі ўжо ня зусім абанкроцілася, дык знаходзіцца на шляху да поўнага правалу лесазагатоўчых плянаў.

Бабруйскае аддзяленьне Лесбелу не адчувае адказнасьці за выкананьне баявога заданьня, яны, мусіць, не адчуваюць адказнасьці за яго выкананьне, не адчуваюць палітычнай і эканамічнай важнасьці забясьпячэньня камбінату сыравінай. Бабруйскае аддзяленьне Лесбелу не зрабілася баявым органам, органам шалёных тэмпаў у галіне практычнага выкананьня вялізарнай палітычнай задачы забясьпячэньня Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату неабходнай сыравінай.

Б. Д—ў.

У АГНІ НАРОДЖАНАЯ
ВОЛАТ
Лепшы фільм—вытворчасьць Белдзяржкіно, выдатныя ўзоры сусьветнай кінематаграфіі.

АПАРАТ ОРГАНАЎ АСЬВЕТЫ

ПАВІНЕН БЫЦЬ У АВАНГАРДЗЕ сацыялістычнага будаўніцтва

А НЕ ЦЯГНУЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ БУЙНЫХ ТЭМПАЎ

Самацёк кіруе работаю хат-чытальняў. У НКА ня ведаюць, які ўдзел павінна прыняць школа ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну. Дырэктывы і схэмы трэба замяніць жывою, канкрэтнаю работаю.

БЯЗЬЛІТАСНАЯ БАРАЦЬБА З УСІМІ, ХТО НЯ ХОЧА ПРАЦАВАЦЬ ПА-НОВАМУ

ШКОЛЫ НА РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ

НАРКАМАСЬВЕТЫ НЕ МАБІЛІЗАВАЎ ШКОЛЫ НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ. „А ШТО ШКОЛЫ ТУТ МОГУЦЬ ЗРАБІЦЬ",—РАЗВАЖАЮЦЬ У НКА

Мы ня раз ужо пісалі аб тым, што Народны Камісарыят Асьветы не пасьпявае за жыцьцём, што праца у апараце апошняга ідзе занадта павольнымі тэмпамі. Правільней кажучы, паміж тэмпамі Наркамасьветы і тэмпамі будаўніцтва, тэмпамі бягучага дню існуюць ножніцы, якія ня змыкаюцца, а мабыць больш разыходзяцца.

Возьмем такое актуальнае пытаньне ўчарашняга, сёньняшняга і заўтрашняга дню, як барацьба за выкананьне прамфінпляну нашымі фабрыкамі і заводамі. Гэта пытаньне стаіць у парадку дню ня першы дзень і ня першы месяц. Не адзін месяц яно будзе стаяць і надалей, бо барацьба за выкананьне прамфінпляну—ёсьць барацьба за выкананьне 5-годкі у 4 гады ёсьць барацьба за хутчэйшую пабудову сацыялізму ў краіне саветаў. У гэтай барацьбе вялікую ролю можа і павінна адыграць наша гарадзкая школа сацыяльнага выхаваньня, а таксама і іншыя культасьветныя ўстановы гораду.

Такая пастаноўка пытаньня зразумела для кожнага палітычна пісьменнага чалавека, але „увы і ах" гэтага на жаль не разумеюць у нашым культурным штабе—у Народным Камісарыяце Асьветы.

Нават ня толькі не разумеюць, але яшчэ і дзівяцца—„што можа зрабіць школа ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну прадпрыёмствамі". Гэта не анэкдот, а адказ нашаму супрацоўніку аднаго з адказных працаўнікоў Наркамасьветы. У выніках такой палітычнай блізарукасьці Наркамасьветы дагэтуль не дадумаўся да таго, каб мабілізаваць гарадзкую школу на барацьбу за выкананьне прамфінпляну. Да этуль з нэтраў Наркамасьветы ня вышла яшчэ нават самага сухотнага абежніка па гэтаму пытаньню. Значная доля віны тут, бязумоўна, павінна быць аднесена і на камсамольскія арганізацыі, якія будучы застрэльшчыкамі шэрагу добрых пачынаньняў, шэрагу палітычных кампаній, забыліся аб гэтай важнай справе.

Вынікі першага кварталу, вынікі выкананьня прамфінпляну за студзень месяц прымушаюць ставіць рашуча пытаньне аб тым, каб на барацьбу за поўнае выкананьне прамфінпляну, а з ім і кантрольных лічбаў 1929-30 году былі мабілізаваны усе сілы, а ў тым ліку і нашы школы.

У той час, калі гарадзкой сямігодцы надаецца усё больш і больш індустрыяльны ўхіл, калі гарадзкая школа павінна быць максімальна набліжана да прамысловай вытворчасьці, яна ня можа застацца ў якасьці „амэрыканскага назіральніка" пры барацьбе за выкананьне прамысловасьцю сваіх прамфінпляваў.

Спэцыяльна для працаўнікоў Наркамасьветы мы напомнім якую ролю адыгралі на усяму Саюзу школы ў барацьбе з п'янствам. Дзіцячыя дэманстрацыі да садружасьцьвенных фабрык і заводаў з патрабаваньнем зачыніць піўныя і магазыны дзяржсьпірту ў рабочых раёнах, удзел вучняў на агульназавадзкіх і фабрычных сходах. Сходы вучняў разам з бацькамі і рабочымі прадпрыемствам у школе. Вось асноўныя мэтады, якімі вяла школа барацьбу з п'янствам. Гэта барацьба дала станоўчыя вынікі.

Чаму не прымяніць гэтыя-ж мэтады і ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну? Школа можа і павінна практыкаваць мэтад сацыялістычнага спаборніцтва з садружасьцьвеннай фабрыкай, або заводам, прад'яўляючы апошнім асноўную ўмову—выкананьне прамфінпляну. Мэтад сацыялістычнага спаборніцтва павінен быць са школы перанесен і ў сям'ю. Школа павінна паставіць справу так, каб кожны вучань заключыў дагавор па сацспаборніцтву з сваім бацькам—рабочым, патрабуючы ад апошняга: поўнага зьнішчэньня прагулаў і спазьненьняў на працу, максымальнага ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы, зьнішчэньня браку і палепшаньня якасьці прадукцыі, уступіць ва ўдарную брыгаду. З свайго боку вучань павінен узяць на сябе абавязак: падцягнуцца ў вучобе, удзельнічаць у школьных грамадзкіх арганізацыях, выконваць усе ўказаньні настаўнікаў, а ў дамашнім быце зьнішчаць усе нездаровыя, непралетарскія погляды і імкненьні і г. д.

Зразумела, мы ні ў якім разе не жадаем даваць штамп у гэтым напрамку, тут жыцьцё павінна паказаць, што трэба ўнесьці ў дагавор. Каб дагавор не застаўся паперкай, брыгады вучняў павінны правяраць як ён ажыцьцяўляецца абодвымі бакамі на прадпрыемстве, у сям'і і школе.

Мы ўжо зазначалі, што вынікі выкананьня прамфінпляну нас задаволіць ня могуць, **а таму школа і культасьветныя ўстановы гораду павінны неадкладна ўключыцца ў самую рашучую барацьбу за поўнае выкананьне прамфінпляну, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.**

В. Зайцаў.

„Дырэктывы далі, але ня ведаем, як выконваюцца"

Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове адзначыў, што **„калгаснае будаўніцтва невыабражальна бяз узмоцненага ўзьняцьця культурнасьці калгаснага насельніцтва. Савецкія органы, уся калгасная сыстэма, сельска-гаспадарчая і спажывецкая кааперацыя і ўся савецкая грамадзкасьць павінны разгарнуць шырокую работу па культурнаму абслугоўваньню калгаснага насельніцтва".** У рабоце па культурнаму абслугоўваньню калгасьнікаў галоўную ролю павінна адыгрываць хата-чытальня.

Першы пункт рэзалюцыі, які прыняты быў у мінулым годзе ЦК УсеКП(б) па пытаньню аб рабоце хат-чытальняў, кажа: **„Хата-чытальня павінна стаць у шмат большай меры, чым у сучасны момант, арганізуючым цэнтрам культурнай і палітычнай актыўнасьці бядняцкіх і серадняцкіх мас. Выключна важнае значэньне набывае яе работа ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі".**

Ці спраўляюцца хаты-чытальні з тымі задачамі, якія на іх усклядаюцца ў сучасны момант? Трэба катэгарычна адказаць, што **не.** Мала гэтага, значная колькасьць гэтых устаноў лічыцца толькі па паперы: установы з замкамі на дзьвярах, як ужо адзначалася ў нашай газэце. Каб ня быць галаслоўным, укажам, што в вялікай колькасьці матар'ялу, які атрымоўваецца ў газэце, мы ня мелі за паўгода ніводнай заметкі, якая сьведчыла б аб дадатных бакох работы якой небудзь хаты-чытальні.

Зразумела, гэта не гаворыць аб тым, што ўсе хаты-чытальні працуюць дрэнна, што спрод хатнікаў няма добрых арганізатараў. Добрыя хаты-чытальні і працаўнікі ёсьць, але іх параўнальна невялікая колькасьць. Асноўнымі прычынамі дрэннай работы хат-чытальняў мы лічым: у большасьці слаба падрыхтаваны кадр хатнікаў, няўважлівыя адносіны некаторых мясцовых партыйных органаў да справы дапамогі хатам-чытальням — складваньні іх работы, слабае кіраўніцтва іх работаю з боку органаў наркамасьветы.

Сапраўды, зараз на вёсцы вырашаюцца вялізарнейшай важнасьці гаспадарча-палітычныя задачы. Масавая калектывізацыя сялянскіх гаспадарак, ліквідацыя кулацтва, як класы, падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы, перавыбары саветаў і г. д. У гэтай важнейшай рабоце павінна прыняць актыўны ўдзел хата-чытальня, як цэнтр культурнай і палітычнай работы сярод батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. Між тым аб рабоце хат-чытальняў у гэтым напрамку нічога ня чуваць.

Надзвычайна цікава, што і НКА абсалютна нічога ня ведае, які ўдзел прымаюць хаты-чытальні у правядзеньні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы. У інспэктарыяце палітасьветы НКА нашаму супрацоўніку адказалі так: **па пытаньню калектывізацыі, вясеньняга севу і г. д. мы палітасьветным установам далі кучу дырэктыў, але як яны выконваюць—мы ня ведаем. Зьвесткі аб працы палітасьветных устаноў мы атрымоўваем адзін раз у год, ды і то праз ЦСУ.** Зразумела, грош цана такой рабоце, калі дырэктывы даюцца і не правяраюцца, як яны выконваюцца.

Гаворачы аб хатах-чытальнях нельга абыйсьці моўчкі і **Магілеўскага палітасьветнага тэхнікуму,** які рыхтуе працаўнікоў культурнікаў для вёскі. **Рэдакцыя газэты „СЬ", прыдаючы вялізарнейшае значэньне культурнаму шэфству над колгасамі, заклікала два разы калектыў настаўніцтва і студэнцтва тэхнікуму ўзяць на сябе ініцыятыву быць арганізатарам гэтай справы. Тэхнікум маўчыць, ён не адгукнуўся на заклік „СЬ", ён ня лічыць патрэбным займацца справаю ўзьняцьця культурнасьці калгаснага насельніцтва.** Наводзіны Магілеўскага палітасьвет-тэхнікуму не павінны прайсьці міма увагі РСІ.

Мы лічым таксама, што абсьледваньнем работы хат-чытальняў павінна заняцца РСІ. Гэта дасьць мажлівасьць грунтоўна вывучыць прычыны недахопаў работы хат-чытальняў і прыняць адпаведныя меры да палепшаньня работы гэтых важных установаў на вёсцы.

Вішнарэўскі.

БОЛЬШ УВАГІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

(Да XII гадавіны Чырвонай арміі)

Праз чатыры дні працоўныя масы нашага СССР будуць сьвяткаваць XII гадавіну рабоча-сялянскай Чарвонай арміі. Гадавіна Чырвонай арміі зьяўляецца вялікім сьвятам ня толькі працоўных нашай краіны, але і сьвятам міжнароднага пралетарыяту, чыя перамога над капіталістамі ў значнай меры залежыць ад абароназдольнасьці СССР.

Вялізарнейшыя дасягненьні нашай краіны ў справе індустрыялізацыі, а таксама калектывізацыі сельскай гаспадаркі вызначаюць канчатковы крах усіх намаў і надзей імпэрыялістаў на зварот СССР да капіталізму. Вось чаму ў апошні час буржуазія ўсіх краін вядзе ўзмоцненую траўлю СССР, падрыхтоўваючы глебу для ўзброенага нападу на краіну дыктатуры пралетарыяту.

XII гадавіна рабоча-сялянскай Чырвонай арміі павінна прайсьці пад знакам яшчэ большага ўзмацненьня Чырвонай арміі—абаронцы і вернага вартаўніка нашай краіны, пад знакам яшчэ большай сувязі Чырвонай арміі з працоўнымі масамі, пад знакам узмацненьня шэфства заводаў, фабрык, культурна-асьветных устаноў і г. д. над паасобнымі часткамі Чырвонай арміі.

У правядзеньні дню Чырвонай арміі павінны прыняць актыўны ўдзел усе культурна-асьветныя ўстановы і працаўнікі гэтых устаноў. Трэба шырока азнаёміць вучнёўскую моладзь з гісторыяй арганізацыі Чырвонай арміі, з гісторыяй яе слаўных перамог над імпэрыялістамі, якія імкнуліся задушыць пралетарскую дыктатуру; перамог над капіталістамі і абшарнікамі, якія імкнуліся захаваць стары лад.

У дзень Чырвонай арміі трэба правесьці агляд працы ячэек ТДА-Авіяхіму пад кутком погляду ўзмацненьня як васпізацыі сярод асьветнікаў і вучняў, так і палепшаньня працы ячэек ТДА-Авіяхіму.

Некалькі год таму назад асьветнікі ўзялі культурнае шэфства над Чырвонай арміяй. З кожным годам праца па культурнаму абслугоўваньню Чырвонай арміі паляпшаецца. Усё большыя і большыя колы асьветнікаў уцягваюцца ў гэту працу. XII гадавіна Чырвонай арміі павінна прайсьці пад знакам яшчэ большага ўзмацненьня працы па культурнаму абслугоўваньню слаўнай рабоча-сялянскай **Чырвонай арміі.**

Праграмы пераапрацоўваюцца

Сучасныя тэмпы індустрыялізацыі краіны і перабудовы ўсіх сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад патрабуюць прыстасаваньня работы ўсіх сеткі культурна-асьветных устаноў да задач сацыялістычнага будаўніцтва.

У нашай газэце ўжо адзначалася, што праграмы і навучальныя пляны ўсіх культурна-асьветных устаноў не адпавядаюць задачам рэканструкцыі народнае гаспадаркі, што трэба іх у бліжэйшы пэрыяд перагледзець і прыстасаваць да задач сучаснасьці.

Цяпер наглядзімо, што робіць Наркамасьветы БССР, каб праграмы навучальных устаноў прыстасаваць да сучасных задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Пачнём з сельска-гаспадарчай асьветы. Трэба адзначыць, што да апошняга часу Наркамасьветы, ня гледзячы на выразныя дырэктывы апошняга пленуму ЦК КП(б)Б аб тэрміновай перабудове ўсіх праграм, мала што зрабіў у гэтым напрамку. І толькі энэргічныя захады РСІ БССР зрушылі гэту справу з тупіку. Навукова-мэтадалёгічны камітэт НКА БССР прыступіў да тэрміновай перабудовы праграм усіх навучальных устаноў.

У сучасны момант у галіне сельска-гаспадарчай асьветы маем гэткае становішча. Тэхнікумы падзелены на 5 асноўных тыпаў: 1) садова-гародны, 2) жывёлагадоўлі, 3) ільнаводзтва, 4) палявых культур. Да апошняга часу тэхнікумы з рознымі спэцыяльнасьцямі былі раскіданы па ўсёй БССР. З новага-ж навучальнага году будуць згрупаваны па кожнай з пералічанай спэцыяльнасьці ў адным месцы.

Мясцом дадзены дырэктывы аб тым, каб прыслалі свае праэкты да новых навучальных плянаў. Тэхнікумы будуць даваць тэхнікаў сельскай гаспадаркі вузкай спэцыяльнасьці, а не як раней універсалаў па розных галінах сельскай гаспадаркі.

Ва ўсіх тэхнікумах БССР розных спэцыяльнасьцяў паводле новых праграм, якія часткова ўводзяцца ў жыцьцё, практыкум у стасунку да тэорыі будзе стасавацца як 1:1.

Навукова-Мэтадалёгічны Камітэт пры Наркамасьветы БССР ў мэтах большай прадукцыйнасьці працы по[illegible] праграм заклікаў з раснаў ленінскіх педагагічныя сілы—дзеля распрацоўкі праграм для ўсіх тыпаў існуючых цяжэйшых і сярэдніх школ і тэхнікумаў. Праца ўжо распачынаецца і трэба спадзявацца, дасьць добрыя вынікі. Гэта дае нам надзею, што к новаму навучальнаму году ўсе нашы школы будуць мець новыя праграмы, прыстасаваныя да ўмоў сацыялістычнага будаўніцтва.

С.

Праспалі ленінскі прызыў ударнікаў

„Ленінскі прызыў ва ўдарныя брыгады павінен ператварыць спаборніцтва тысяч у спаборніцтва мільёнаў, павінен разьвязаць задачу пагалоўнага ўцягненьня мас у сацыялістычнае спаборніцтва".

(З адозвы УсеЦСПС і ЦК ЛКСМ).

На жаль гэтай вельмі важнай палітычнай задачы не зразумела Цэнтральнае Праўленьне саюзу працаўнікоў асьветы, не зразумелі яе і акруговыя аддзяленьні апошняга. 23 студзеня ЦСПСБ тэлефонаграмай прапанаваў усім цэнтральным праўленьням саюзаў арганізаваць 27 студзеня ў дзень пахаваньня Ўладзімера Ільліча мітынгі на заводах па пытаньню вярбоўкі ленінскага прызыву ўдарнікаў. Былі дадзены і больш падрабязныя дырэктывы, але па нашай думцы досыць было ўжо аднэй адозвы УсеЦСПС для таго, каб шырока разгарнуць кампанію па вярбоўцы ленінскага прызыву ударнікаў і сярод асьветнікаў.

У ЦП саюзу працасьветы меркавалі інакш: калі гаворыцца аб заводах, дык гэта нас не датычыцца, а таму ніякіх дырэктыў і паказаньняў па гэтаму пытаньню нізавым прафарганам не далі.

Між тым тэмп падрыхтоўкі культурных кадраў адстае ад нашага гаспадарчага будаўніцтва, а таму перад навучальнымі ўстановамі і асьветнікамі стаіць задача самкнуць ножніцы гаспадарчага будаўніцтва з падрыхтоўкай кадраў. Тут асаблівае значэньне набываюць ударныя брыгады асьветнікаў. Трэба усю культасьветную працу паставіць на рэйкі выкананьня пяцігодкі. Пачалася рэзалюцыя ў быце, а мы дагэтуль яшчэ не прыстасаваліся да выкананьня гэтай важнай задачы. Ні нашы вучэбныя праграмы, ні мэтады нашай працы яшчэ не перабудаваны ў адпаведнасьці з новымі патрабаваньнямі жыцьця.

Ударнікі-асьветнікі павінны стаць зьвяном, якое пашырае сабою усю сетку нашых культасьветных устаноў на шляху выкананьня пяцігодкі. Нашы школы павінны [illegible] часьці. Мы шмат гаварылі аб разгортваньні грамадзкай працы сярод вучняў, аб увядзеньні ў школах працоўных працэсаў і г. д., але яшчэ вельмі мала зрабілі ў гэтай галіне. І тут прыклад павінны паказаць ударнікі-асьветнікі.

Ударнікі не павінны замыкацца ў сьценах сваёй установы, а трэба ўдарную працу паставіць так, каб паміж установамі, паміж асобнымі школамі была шчыльная сувязь. Часта мы працуем ударным парадкам, але ўдараемся ў дробязі і буйныя пытаньні застаюцца з боку. Трэба вылучыць найбольш важныя палітычныя пытаньні і ўцягваць у вырашэньне іх усю масу асьветнікаў, усе нашы школы.

Максымальнае разгортваньне ударных брыгад, папаўненьне калён ударнікаў новымі кадрамі асьветнікаў—вось баявая задача прафорганаў саюзу працасьветы.

Як-жа стаіць справа з ударніцкім рухам сярод асьветнікаў БССР?

Яшчэ некалькі месяцаў таму назад асобныя энтузыясты-асьветнікі Гомелю і іншых гарадоў абвяшчалі сябе ўдарнікамі, гэтае пытаньне абгаварвалася асьветнікамі па сваёй ініцыятыве. Некаторыя „асьветнікі" ўдарнікам давалі мянюшку „выскачкі" і накшталт гэтага, але рух ударніцтва сярод асьветнікаў пашыраецца. Мы маем ударнікаў па шэрагу ўстаноў у Менску і іншых гарадох БССР. Гэты рух пачаў Бярэзінская раённая канфэрэнцыя асьветнікаў абвясьціла сябе ўдарнай і паставіла перад сабой шэраг практычных задач як у вучэбна-выхаваўчай галіне, так і ў вырашэньні палітычных задач сучаснага моманту.

Прафорганы асьветнікаў не падхапілі належным чынам ініцыятыву энтузыястаў і не ператварылі гэты рух у масавы. Мы ўжо зазначалі, што ЦП саюзу праспала кампанію ленінскага прызыву ўдарнікаў, але час яшчэ ня згублены і трэба навярстаць упушчанае. Саюз павінен дабіцца максымальнага разгортваньня руху ўдарніцтва, ператварыць гэты рух у масавы. Задачы бягучага моманту выклікаюць ад асьветнікаў разгарнуць працу над лёзунгам—ніводнага асьветніка па-за ўдарнай брыгадай. Ад асобных ударнікаў, ударных брыгад трэба будзе перайсьці па ўдарныя ўстановы.

В. Паўночны.

Нельга так рабіць

(Гомельшчына)

Школьная рада Буда-Кашалёўскай сямігодкі ўхваліла дармовымі вучэбнымі прыладамі заблысьпечыць выключна адных толькі дзяцей калгасьнікаў. Дзеля гэтага, раней выданыя кніжкі дзецям некалгасьнікаў ад апошніх адабралі.

Трусянкоў Віктар — бядняк, маці ўдава мае 4 га зямлі і адну карову, жыве ў чужой хаце. Брат Трусянкова —камсамолец уступіў у калгас, але маці не жадае ўступаць. На падставе гэтага ў Трусянкова адабралі раней выданыя яму кніжкі, таксама не выдаюць стыпэндыі, ня гледзячы на тое, што адна вольная ёсьць.

Педагогі з Кашалёўскай сямігодкі, ці так праводзяць клясавую лінію?

Міх. Р.

Пакуль што дрэнна

(Шклоўскі р., Магілеўшчына)

Збор другараднай сыравіны школамі праходзіць слаба. З 68 школ раёну толькі некаторыя заняліся сур'ёзна гэтай важнай справай. Шклоўская школа ўжо сабрала звыш 10 пудоў рознай уцільсыравіны і здала, за што атрымала сшыткі. Бушлякоўская школа сабрала звыш 15 пудоў.

Але вось тут і недарэчнасьць, калі пачалі здаваць, дык прынялі ўсяго толькі 5 пуд., а апошнія 10 не прынята. Збор попелу таксама не праводзіцца школамі, за выключэньнем адзінак. Праўда, тут часта віноваты раённыя працаўнікі. Летась крычалі зьбіраць попел, а калі сабралі школы і ўстановы, дык ён і зазімаваў, ніхто ня браў. Такія ляпсусы выходзяць і з другараднай сыравінай; калі здаеш 15 пуд., прымаюць 5.

Р. Хвойка.

Брыгады менскіх асьветнікаў рапартуюць

На сходзе ў Доме асьветы больш 400 чалавек. Сабраліся асьветнікі гораду, каб падвесьці вынікі работы сваіх брыгад, якія пасылаліся ў вёску для ўдзелу ў калектывізацыі і падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы. Адна брыгада зьмяняе другую, каб далажыць агульнаму сходу аб сваёй рабоце. Вынікі ня дрэнныя: толькі па пяці раёнах арганізавана сіламі брыгад 24 калгасы, у 30 калгасах абагулена маёмасьць і пяць калгасаў узбуйнены. Брыгады, апроч гэтай работы, дапамагалі падрыхтоўцы да вясеньняга севу.

Дакладвае брыгада, якая выяжджала ў Сьмілавіцкі раён. Брыгада правяла 15 сходаў беднаты і серадняцтва у Петравіцкім сельсавеце па пытаньню калектывізацыі. Узбуйніла „першамайскі" калгас на 50 гаспадарак, узбуйніла яшчэ адзін калгас і арганізавала новы калгас „Победа". Брыгада аформіла калгасы, прыняла ўдзел у абагуленьні маёмасьці і ачыстцы насельня.

Вялікую работу правяла брыгада, якая выяжджала ў Халопеніцкі раён. Гэта брыгада па Кашынскаму с.-с. арганізавала 11 калгасаў, прычым тры калгасы на цілінным па 2000 га. Брыгада прымала ўдзел у абагуленьні насельня, сродкаў вытворчасьці і г. д. Праведзена з удзелам брыгады 12 сходаў. У гэтым сельсавеце вядзецца работа па арганізацыі кузьні, будуюцца аборы для абагуленай жывёлы. Брыгада канстатуе, што сельсавет ня кіруе справаю калектывізацыі. Члены сельсавету самі застаюцца па-за калгасамі. Былі выпадкі раскулачваньня сераднякоў, але гэта было выпраўлена. Ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМ слаба кіруюць калгасным рухам. Мясцовае настаўніцтва само слаба арыентуецца ў пытаньнях калектывізацыі і ня можа прыняць актыўнага ўдзелу ў гэтай рабоце.

Па Смалявіцкаму раёну брыгада таксама правяла вялікую работу. У тым сельсавеце, дзе брыгада працавала, раскулачана тры настаўнікі, якія маюць уласныя гаспадаркі. Удзел настаўніцтва ў калектывізацыі ў гэтым сельсавеце незаметны.

Брыгада, якая выяжджала ў Астрашыцка-Гарадоцкі раён канстатуе, што з боку мясцовых органаў ня было ніякай дапамогі і кіраўніцтва ў рабоце брыгады. Брыгада арганізавала калгас у Беларускім с.-с., узьняла калгасны рух сярод сялянства, палажыла пачатак абагуленьню сродкаў вытворчасьці сярод сялянства. Брыгада адзначае, што для вёскі ў сучасны момант надзвычайна патрэбны працаўнікі. Патрэбна вялікая растлумачальная работа сярод сялянства. Калі на адным сходзе зайшла рэч аб дзіцячых яслях, дык адна сялянка зразумела яслі як кармушку для коняй. Настаўніцтва ў Беларускім с.-с. ніякага ўдзелу ня прымае ў калгасным руху.

Такая-ж работа праводзілася брыгадамі ў Койданаўскім і Пухавіцкім раёнах.

Урэшце брыгады і сход адзначылі, што самі асьветнікі яшчэ недастаткова палітычна падкаваны, каб прынесьці сваёю работаю яшчэ большую карысьць сацыялістычнаму будаўніцтву. Асьветнікі пастанавілі з большай энэргіяй узяцца за вывучэньне тэорыі марксізму і ленінізма для прымяненьня тэорыі у сваёй штодзённай практычнай рабоце.

Я. М.

Школа рыхтуецца да веснавой сяўбы

(Чарэйскі р., Аршаншчына)

Наша Харытанцаўская школа праводзіць падрыхтоўчую працу да сяўбы. Настаўнікамі праведзены ў трох вёсках агульныя сходы гр-н, дзе ставілася пытаньне аб веснавой сяўбе. У в. Харытанцы, Чараёўка і Забарочча ўжо абгулілі ўсё насеньне для засеву яравога кліну,

Усе вёскі ўхвалілі з кожнае печы сабраць ня менш 3-х пудоў попелу, што будзе складаць 300 пудоў. Усе вёскі пастанавілі даць задатак на трактар, разам 250 руб. Каб хутчэй набыць трактар, калгасьнікі ўзяліся вывесьці агулам 40 кубоў дроў з лесу, а грошы гэтыя цалкам аддаць на трактар. Кулакоў раскулачылі, усё зярно пашло на карысьць калгасаў. Да 15 лютага абагулена ўжо ўся жывёла ў гэтых вёсках для калгасу. Сярод насельніцтва адчуваецца бадзёры настрой.

Лапіцкі.

Выклікаем Вузьдзенскі раён

Асьветнікі Койданаўскага раёну, пад кіраўніцтвам райгрупкому, правялі наступную працу: 1) Загадзя падпісаліся на пазыку калектывізацыі на месячны аклад, што будзе складаць больш 9.000 руб. 2) Адлічылі аднадзённы заробак на пакупку трактара. 3) У час зімовага адпачынку асьветнікі м-ка выехалі ў вёску для правядзеньня працы па калектывізацыі

Асьветнікі Койданаўскага раёну выклікаюць на выкананьне першых двух пунктаў Узьдзенскі раён.

Андрэева.

Агні вялікага паходу

Бунт

Была вёска Кашына.

Зусім невялікая, складася яна з 24 двароў. Была ў ёй вуліна вузкая... Адны хаты — пакрыўленыя, другія крыху лепш. А наогул жыцьцё ішло звычайным парадкам—дні за днямі ў працы. Жыло Кашына звычайным законам жыцьця.

За вёскаю ляжала зямля—суглінкавая, мала ўрадлівая. Ад зямлі быў і галоўны прыбытак.

— У каго зямлі больш было ды сілы—таму і весялей жылося,—кажуць сяляне.

Але вось у вёсцы стварылася таварыства па агнятрываламу будаўніцтву.

Яно выпісвала газэту „Беднота".

Чыталі яе мала хто,—ня было часу, ды прывычкі таксама. Больш за ўсё чытаў вясковец Стахоўскі Пракоп. Ён быў на імпэрыялістычнай вайне, потым—у нямецкім палоне. Бачыў, што жывуць там лепш, людзі больш культурныя. А з газэты ён даведаўся, як можна лепш направіць сваё жыцьцё, палепшыць дабрабыт, а хутчэй за ўсё можна гэта зрабіць было праз камуну.

Тады яшчэ страшна было гэта слова для некаторых вяскоўцаў—яно палохала.

— Камуна—разам... Майго нічога ня будзе. Працуй дзень і ноч...

Але больш перадавыя разам з Пракопам Стахоўскім зьбіраліся ў вольныя часы і думалі яны, спрачаліся, крычалі. Што рабіць?

Але жыць было цяжка..

У 1927 годзе пачалі гаварыць аб камуне. Яны пачалі бунтаваць супроць старога ладу. Доўга гаварылі, шукалі сваёй мужычай праўды ў газэтах. А больш сьмелыя бачылі ўперадзе, у далячыні прыгожыя малюнкі дружнай калектыўнай працы, дзе людзі зрабіліся цьвярозыя розумам, дзе зямля апрацаваная машынамі давала добры ўраджай і дзе жылося вальней і прыгажэй.

Нарэшце, тыя, хто думаў, адважыліся і сказалі:

— Будзе!

Цяжка было, напэўна, сказаць гэта а яшчэ цяжэй было рабіць.

У пачатку 1928 году запісалася ў камуну 10 кашынскіх двароў. Адна батрачка з сям'ёю, два сераднякі, а астатнія беднякі... Зараз-жа прынялі статут камуны і распачалі абагульваньне насеньня, жывёлы і інвэнтару. Гэта зрабіць было ня цяжка, бо мала было чаго і абагульваць. На скорую руку зьляпілі хлявы, хаты, абы можна было пакуль пражыць. Асноўны капітал быў—4.600 руб. Прывялі будучыя камунары сваіх 9 коняў, 9 кароў,—авечак зусім ня было.

І пачалі 72 душы, з якіх 42 чалавекі працаздольных, жыць, жыць і будаваць, перамагаць на 101 га ня зусім ураджлівай зямлі. Камуну назвалі —„Х Кастрычнік".

А ворагі камуны пачалі зыкаць і расказваць пра камуну нябыліцы—агідныя і злосныя.

Важна было, што людзі пасьля бунту супроць адвечнага ладу коснасьці, пералому старога жыцьця адчувалі сябе хоць пакуль ня зусім, але гаспадарамі гэтага жыцьця.

Гаты пераходны характар натуральна быў зьвязаны з супярэчнасьцямі і ўнутранай барацьбой.

За два гады камуна вырасла.

Яна невялікая—гэта толькі першы аганёк у вялікім паходзе за калектывізацыю, але яна будзе расьці...

У гэтым годзе да яе далучаецца Чаркасаўская камуна, так званая «бабская», дзе 14 жанчын і 4 мужчыны і дзе старшыня камуны—жанчына.

Ад вакольнага сялянства наступае шмат залу аб прыёме іх у камуну.

Значыць—камуна будзе расьці.

В. Наваль

Прыстасаваць сетку культасьветных устаноў да сеткі калгасаў

(У парадку абгаварэньня)

Шпаркі тэмп калектывізацыі, перабудова вёскі на новы сацыялістычны лад ставіць пытаньне аб рэарганізацыі тэрытарыяльных цэнтраў у адпаведнасьці з новымі задачамі новай калектывізаванай гаспадаркі.

Арганізацыя тэрыторыі калгасаў з галоўнай (цэнтральнай) гаспадаркай і падсобнымі гаспадаркамі бязумоўна парушаюць тэрытарыяльнае разьмяшчэньне некаторых паселішчаў,

Калі да гэтага часу да пабудовы тэрытарыяльнага пляну увядзеньня ўсеагульнага навучаньня і пашырэньня школьнае сеткі мы выходзілі з тых адміністрацыйна- гаспадарчых межаў, якія былі да гэтага часу, то зараз у сувязі з перамяшчэньнем гаспадарчых цэнтраў—па-першае, і ў сувязі з новымі формамі і мэтадамі работы ва ўмовах калектывізацыі вёскі—па-другое, мы бачым, што былыя пляны ня вытрымоўваюць ніякае крытыкі.

Калі мы раней дамагаліся зьнішчэньня ліку аднакамплектаваных школ, і лічылі вялікім дасягненьнем наяўнасьць двухкамплектавых школ, то зараз і гэта нас не здавальняе і, як правіла, мы павінны імкнуцца да ўстанаўленьня цьвёрдай сеткі 4 камплектавых школ (чатыры настаўнікі па чатыры групы).

Побач з гэтым, трэба адзначыць, што думка і імкненьне некаторых таварышоў аб арганізацыі аднэй школы на тэрыторыі калгасу (сярэднім мы лічам калгас у 8-10 тыс. га, мае цэнтральную гаспадарку у 2-3 тыс. га і 3-4 падсобных на 2-3 тыс. га), куды будуць зьмешчаны дзеці і з падсобных гаспадарак—яшчэ не пасьпела, бо яна патрабуе значнай траты сродкаў, памяшканьня, інтэрнату, абсталяваньня і г. д.

Такім чынам я лічу, што кожная падсобная гаспадарка, якая ў сярэднім будзе мець 2000-3000 га з абслугоўваючым пэрсаналам у 200—300 сямей,—павінна мець абавязкова 4-х камплектовую школу з 4-х гадовым курсам навучаньня. У кожнай такой гаспадарцы павінны быць дзіцячыя яслі, дзіцячая пляцоўка і нулявая група пры 4-х годцы.

У цэнтры калгасу павінна быць вышэйпачатковая школа (школа калгаснага вучнёўства з адпаведным сродкаў перасоўваньня, магчыма абслужыць усе падсобныя гаспадаркі 3—6 раз у м-ц.

Выносячы гэтыя меркаваньні на абгаварэньне савецкай грамадзкасьці, лічу патрэбным, каб органы Наркамасьветы, як у цэнтры, так і на мясцох заняліся гэтым пытаньнем.

Якуб Караткевіч.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ПАШЫРЭНЬНЕ НА РАБОЧЫХ, ЯКІЯ ВУЧАЦЦА НА КУРСАХ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ Ў ВЫШЭЙШЫЯ ШКОЛЫ І ТЭХНІКУМЫ, ЛЬГОТ, УСТАНОЎЛЕНЫХ ДЛЯ ВУЧНЯХ РАБОЧЫХ ФАКУЛЬТЭТАЎ

На падставе пастановы СНК СССР ад 2 студзеня 1930 году „Пра пашырэньне на рабочых, якія вучацца на курсах для падрыхтоўкі ў вышэйшыя школы і тэхнікумы, льгот, устаноўленых для вучняў рабочых факультэтаў", Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Пашырыць на рабочых, якія вучацца на курсах для падрыхтоўкі ў вышэйшыя школы і тэхнікумы і працуюць беспасрэдна на вытворчасьці, усе правы і ільготы, устаноўленыя для вучняў рабочых факультэтаў.

2. Прапанаваць арганізацыям, пад ведамам якіх знаходзяцца курсы для падрыхтоўкі ў вышэйшыя школы і тэхнікумы, і Народнаму Камісарыяту Асьветы сачыць за выкананьнем гэтай пастановы.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. Калевіч.**

13 лютага 1930 г. г. Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра парадак захаваньня запасных капіталаў арганізацый жыльлёвай каапэрацыі

У адпаведнасьці з пастановаю СНК СССР ад 13 верасьня 1929 г. „Пра дапаўненьне пастановы ЦВК і СНК СССР пра парадак захаваньня і выдаткаваньня запасных капіталаў каапэрацыі" (З. З. СССР 1929 г., № 61, арт. 562) Савет Народных БССР **пастанаўляе:**

1. Запасныя капіталы арганізацый жыльлёвай каапэрацыі павінны захоўвацца, як саюзы жыльлёвай каапэрацыі, жыльлёва-будаўнічыя і жыльлёва-арэндныя каапэрацыйныя таварыствы свае запасныя капіталы перавесьці ў Белкамунбанк.

2. Абавязаць Белжылсаюз, акруговыя

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР **БЭНЭК.**

Кіраўнік апрыў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. КАЛЕВІЧ.**

13 лютага 1930 г. г. Менск.

Актыўна ўзяліся за работу

(У Прэзыдыуме ЦП саюзу будаўнікоў)

Брыгада, вылучаная па саюзу будаўнікоў, у колькасьці 12 асоб для дапамогі ў вясновай пасеўнай кампаніі і практычнай дапамозе ў будаўніцтве калгасаў у падшэфным Астрашыцка-Гарадзецкім раёне, выехала з Менску 6 лютага. Райкомам КП(б)Б была праведзена інструкцыйная парада членаў бюро райкому КП(б)Б. Брыгада была падзелена на тры часткі: адна ў колькасьці 5 таварышоў рабочых накіравалася ў калгас „Юны камунар" Шэпелеўскага сельсавету, другая брыгада ў колькасьці 4 таварышоў—3 рабочых і аднаго рахункавода накіравалася ў калгас „Труженик" Астрашыцкага сельсавету, а трэцяя брыгада, якая складаецца з 2 таварышоў: урача і сястры накіравалася ў калгас „Кандрацэвічы" Астрашыцкага сельсавету, дзе сярод калгасьнікаў лютуе сыпны тыфус.

Першая брыгада, па прыезьдзе на месца, узялася за перабудову канюшні, а ўвечары быў скліканы сход усіх запісаўшыхся ў калгасы. Брыгадзірамі быў зроблены даклад аб значэньні калектывізацыі, важнасьці пасеўнай кампаніі гэтага году, аб абагуленьні насельня, жывёлы і сельска-гаспадарчага інвэнтару. У выніку ўсе прысутныя на сходзе калгасьнікі згадзіліся зрабіць поўнае абагульваньне насельня, жывёлы і інвэнтару.

Другая брыгада пару дзён, за адсутнасьцю цьвікоў і інструментаў, нічога не рабіла, але потым былі знойдзены патрэбныя матар'ялы і брыгада распачала работу. Зроблены хлявы для жывёлы і коняй. Пачалі перабудову адзнэй хаткі пад кузьню для калгасу.

У Астрашыцка-Гарадзецкім раёне маецца 42.000 га зямлі разам з сенажацьцю. З гэтай колькасьцю зямлі ў калгасы аформлена на 10-е лютага 12.500 га. Арганізавана і аформлена 17 калгасаў. [illegible] абагуленай зямлі яшчэ не закончана. Характэрна адзначыць, што пры раскулачваньні кулака Танізовіча Юльяна ў Шэпелеўскім сельсавеце, старшыня апошняга Вайтовіч—падкулачнік--дапамог кулаку Танізовічу, які меў 120 га зямлі, 4 каровы, 2 коняй, 5 тон аўсу, 16 тон бульбы, 8 тон канюшыны, 9 тон сена, 7 шт. сьвіньняў і хатняй мэблі на суму каля 1.000 руб.—разбазарыць усё гэта, і калі прышлі раскулачваць, ужо амаль што нічога ня было. Тое-ж самае старшыня сельсавету Вайтовіч зрабіў і з кулаком Пятрушка.

Што датычыцца падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі, кіраўніцтва калгасным рухам з боку Райвыканкому, дык трэба адзначыць што яно вельмі недастатковае. Няма плянаў, ачыстка зерня праводзіцца вельмі слаба, абагульваньне праводзіцца не адпедным тэмпам. Райвыканком ня мае пэўных вестак аб патрэбнасьці насеньня, аб колькасьці раскулачаных кулакоў, аб ліку абагуленага інвэнтару, насеньня і жывёлы.

Райвыканкому цяжка справіцца з пастаўленымі задачамі, не хапае людзей, як палітычнай сілы, так і рабочых брыгадзіраў па правядзеньню рамонту і дапамозе ў іншых галінах будаўніцтва калгасаў па раёну. На гэта трэба саюзу будаўнікоў, як шэфу зьвярнуць асаблівую увагу і падасьць патрэбную колькасьць людзей. З мясцовых камуністаў маюцца і такія, якія падрываюць аўтарытэт партыі, чым зрываюць работу па калектывізацыі і правядзеньню вясновай пасеўнай кампаніі. Прыклад наступны: т. Бацілоўскі, абазчык, член партыі, які быў вылучаны ўпаўнаважаным Райкому КП(б)Б і Райвыканкомам па Астрашыцкаму сельсавету праводзіць калектывізацыю ў калгасе „Труженик", замест таго, каб выканаць у тэрмін даручаную работу, ён напіўся п'яным і сарваў работу камісіі па [illegible]

На ўсё гэта трэба зьвярнуць увагу.

Кіраўнік брыгады **Байкоў.**

З-пад пяра рабселькора

У вёсцы Прылуцкая-Слабада, Самахвалавіцкага раёну (Меншчына) за адсутнасьцю кіраўніка праца па ліквідацыі няпісьменнасьці не разгорнута. **Т.**

* * *

У вёсцы Лошыцы (Меншчына) грамадзкая работа культае. Ёсьць нардом, ёсьць камсамольская ячэйка, але не паставілі работы належным чынам. У нардоме заўсёды танцулькі, гандаль гэрэлкай і іншыя „развлекательные" вечары. Лошыца мае і сваіх культурных шэфаў--Белпэдтэхнікум, але і той нічога не дапамагае, усё абяцаюць—як будуць замаразкі. А калі яны будуць? **Селькор М.**

* * *

Настаўніца Такайскай школы (Лагойскі раён, Меншчына),—Маўчан ніякай грамадзкай работы не праводзіць.

Акадэмічная пасьпяховасьць вучняў зусім нізкая. Самакіраўніцтва школы ў загоне. Калі які небудзь вучань зазначыць на недахопы настаўніцы, дык яна яго называе „хамам", „заціршчыкам" і іншымі брудными словамі. **Грымкевіч.**

* * *

Загадчык Ельскага Нардому (Мазырщчына) Барэнка—эксплёатуе хатнюю работніцу. Барэнка нейкім чынам прыстроіў сваю жонку на працу вартаўніком нардому і загадчыкам гасьцініцы, але ўсю працу як у нардоме, так і ў гасьцініцы, выконвае хатняя работніца, атрымоўваючы 10 руб. у м-ц. **Рэвелеў.**

У Чарэйкаўскім раёне, Аршанскай акругі арганізаваўся калгас імя газэты „Савецкая Беларусь".

Калгас раскінуўся на плошчы 1.000 гэктараў.

Зараз калгасьнікі руйнуюць старыя межы; абагульваюць жывёлу, інвэнтар, а таксама праводзіцца культурна-выхаваўчая работа. Калгасьнікі пастанавілі царкву аддаць пад клюб.

Дубінец П.

* * *

У Гуманаўскай школе, Крупскага раёну (Аршаншчына) працуе настаўнік Чаркасаў, які на працягу двух год калечыць вучняў. Ставіць вучняў на калені, б'е іх і вельмі часта пакідае вучняў „без абеду", сам у гэты час ідзе ў другую вёску, а вучні сядзяць пад замком да цямна і толькі па міласьці вартаўніка выпушчаюцца.

Стаховіч.

Калі будзе канец валакіце

У Змычкаўскім сельсавеце, Уваравіцкага раёну (Гомельшчына) да гэтага часу ня было ніводнай студзі. Па ініцыятыве настаўніка А. Дандзілы і па дагаворанасьці з РВК студня была пабудавана. Але настаўнік свае грошы патрацію, а РВК яму ня хоча зьвярнуць іх, адказваючы, што „яшчэ пытаньне ня вырашана". Калі гэта „сьвята" будзе? **Н-скі.**

У Прэзыдыуме ЦВК БССР

17 лютага 1930 г. пад старшынствам тав. А. І. Хацкевіча адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК БССР. На гэтым пасяджэньні разам з іншымі разгледжаны былі наступныя пытаньні:

Даклад Бабруйскага Гарсавету

Заслухан даклад старшыні Бабруйскага гарсавету тав. Бурдова і садаклад в. аб. загадчыка аргаддзелу Прэзыдыуму ЦВК тав. Вінаградава пра дзейнасьць Бабруйскага гарадзкога савету.

У працы гарсавету ёсьць за апошнія 1½—2 гады шэраг дасягненьняў, якія сказваюцца: у згуртаваньні вакол гарсавету значнага актыву рабочых, служачых, вайскоўцаў; у арганізацыі прапрацоўкі ў сэкцыях розных плянавых пытаньняў, ва ўзмацненьні ўвагі пытаньням добрабыту гораду. Аднак, побач з гэтым у працы гарсавету маюцца і буйныя недахопы. Пытаньні пяцігодкі, падняцьця прадукцыйнасьці працы, зьніжэньня сабекошту амаль зусім не абмяркоўваліся Пленумам Гарсавету. Гарсавет не заслухоўваў дакладаў мясцовых трэстаў і буйнейшых прадпрыемстваў ВСНГ, ня вывучаны пытаньні выкананьня прамфінпляну. Гарсавет таксама не рэагаваў на ненармальныя зьявішчы, меўшыя месца па шэрагу прадпрыемстваў мясцовай прамысловасьці (узрост прагулаў, няшчасныя выпадкі і г. д.) У горадзе Бабруйску ў наступны момант заканчваецца будаўніцтва швэйнай фабрыкі, а таксама пачата пабудова хлебазаводу; з найбольш буйных мерапрыемстваў культурнага значэньня трэба адзначыць прыступленьне да пабудовы памяшканьня пад тэатр. Гарадзкі бюджэт увесь час значна ўзрастае і на [illegible] суму ў 2.329.800 рублёў. Недахопам зьяўляецца слабае прыцягненьне рабочых мас да папярэдняга абмеркаваньня бюджэту. Сувязь Гарсавету з прадпрыемствамі была недастатковай. Шмат увагі зьвярнуў гарсавет дабрабыту гораду (правядзеньне вадаправоду, брукаваньне вуліц, пабудова новых дамоў). У прыватнасьці, у суадпаведнасьці з наказам выбаршчыкаў, палепшана становішча акраін. За апошні час на акраінах гораду арганізаваны два буйных калгасы.

Аднак, гарсавет пакуль-што ня досыць энэргічна прыняўся за справу практычнай дапамогі калектывізацыі бядняцка-сераднякіх гаспадарак вёскі наогул.

Вакол дакладу гарсавету разгарнуліся спрэчкі, у якіх выказаліся т. т. Кандраль, Бэйлін, Нахільніцкі, Хацкевіч.

Для распрацоўкі праэкту пастановы па дакладу ўтворана камісія ў складзе т. т. Бэйліна, Дубяўцова, Вінаградава, Нахільніцкага і Бурдава.

Аб абслугоўваньні вясковага насельніцтва, якое ўваходзіць у гарадзкую мяжу

Прэзыдыум ЦВК, з мэтаю палепшаньня абслугоўваньня батрацкіх і бядняцка-сераднякіх мас прыгарадных паселішч, пастанавіў зацьвердзіць рашэньне Менскага гарсавету аб злучэньні Сьлепнянскага і 1-га прыгараднага сельскіх саветаў гарадзкой мяжы ў адзін, пад назваю „Прыгарадны сельсавет" з цэнтрам у гор. Менску. Бабруйскаму гарсавету дазволена арганізаваць Прыгарадны савет на падставе сельскага савету з прыгарадных паселішчаў: Бярэзінскі фарштадт, Паплавец, Глубокі, Шчыгельскіх, Млынок, Лягерная Слабодка.

У адміністрацыйна-тэрытарыяльных адносінах прыгарадныя саветы падпарадкаваны адпаведным гарадзкім саветам—Менску і Бабруйску.

Прэзыдыум ЦВК даручыў усім акруговым выканаўчым камітэтам вывучыць і падаць свае меркаваньні аб мэтазгоднасьці арганізацыі прыгарадных саветаў і ў іншых гарадох.

Аб удзеле членаў ЦВК у калектывізацыі сельскай гаспадаркі

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў зьвярнуцца да ўсіх членаў і кандыдатаў у члены ЦВК БССР—рабочых і сялян з лістом аб актыўным іх удзеле у калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Аб правядзеньні міжнароднага жаночага дню

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў цыркуляр усім акруговым і раённым выканаўчым камітэтам аб правядзеньні Міжнароднага Жаночага Камуністычнага Дню—8 сакавіка.

Аб часопісу „Саветы Беларусі"

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў рэарганізаваць дадатак да газэты „Савецкая Беларусь"—„Саветы Беларусі" у асобны штомесячны часопіс, які выдаваць, як орган Прэзыдыуму ЦВК БССР. У задачы часопісу ўваходзіць мабілізаваць увагу саветаў вакол задач: арганізацыі батрацка-бядняцкіх мас і ўзмацненьні іх саюзу з сераднякоў; кіраўніцтва калгасамі; ажыцьцяўленьня практычных мерапрыемстваў, вынікаючых з палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы; нацыянальнага будаўніцтва; працы сярод жанчын, падрыхтоўкі кадраў і інш. Часопіс разьлічаны, галоўным чынам, на абслугоўваньне шырокага нізавога савецкага актыву. Для кіраўніцтва часопісам і яго рэдагаваньня ўтвараецца рэдакцыйная калегія.

Пра ўзаемнае страхаваньне саматужнікаў і рамесьнікаў

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў праэкт пастановы ЦВК і СНК БССР пра ўзаемнае страхаваньне саматужнікаў і рамесьнікаў.

Для забясьпечаньня саматужнікаў і рамесьнікаў у парадку ўзаемнага страхаваньня ў акруговых гарадох БССР арганізуюцца акруговыя касы ўзаемадапамогі прамысловай каапэрацыі і Беларускі рэспубліканскі іх Саюз у г. Менску. Задачамі акруговых кас зьяўляюцца: выдача часовай дапамогі па часовай непрацаздольнасьці ў выпадку бесправерку, родаў, на карэленьні дзіцяці і на пахаваньне, аказаньне мэдычнай дапамогі і інш. Членамі касы могуць быць члены прамыслова-каапэрацыйных і працоўных арцеляй, а таксама і саматужнікі-адзіночкі, не пазбаўленыя выбарчых правоў.

Назначэньні.

Т. Барсукоў М. І. аслабанён ад абавязкаў Народнага Камісара Аховы Здароўя БССР. Народным Камісарам Аховы Здароўя БССР назначан тав. Цэнцыпэр, Я. С.

Кандыдат у Члены Прэзыдыуму ЦВК БССР тав. Анішчанка С. В. аслабанён ад працы ў Прыёмнай Прэзыдыуму ЦВК, у зьвязку з адкамандыраваньнем яе на сталую працу ў калгас.

Бяз плянаў і гаспадарчага падыходу

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта)

Рэгуляваньне ракі Арэсы зьяўляецца адной з асноўных і грандыёзных работ на Мар'інскім калфондзе. Але яшчэ і да гэтага часу няма ў кіраўніцтве стала зацьверджанага пляну рэгуляваньня яе. Работы па асушцы балота таксама ня маюць зацьверджаных плянаў.

Пабудова такіх будынкаў, як брандвахты (будынкі на заводзе для жыцьця абслугоўваючага землячарпальных машыны пэрсаналу), пабудова пантонаў і інш. праводзіліся таксама без усялякага пляну. Тут панаў у кіраўніцтве няма цьвёрдага каштарысу.

Такая самая бясплянавасьць нагладаецца і ў пабудове тэлефону і дарогі на мяст. Любань. Пабудова чыгункі да калфонду таксама была распачата бяз плянаў ня пабудовы.

Бясплянавасьць дала сабе адчуваць. [illegible] та сродкаў, перарабленьне зробленага, розныя тэхнічныя недагляды і непаладкі.

Пры пабудаваньні чыгункі выявілася, што профіль яе быў складзены няправільна, праводка тэлефону рабілася саматужным чынам. Некаторыя работы па капаньні каналу выкананы ня правільна, зробленае прыходзіцца нанава перарабляць, на што затрачана ўжо каля 10 тысяч руб.

Адсутнасьць належнага тэмпу ў рабоце прывяла таксама да выдаткаваньня лішніх сродкаў. З-за маруднае пабудовы брандвахт і іншых памяшканьняў для жыцьця працуючых на калфондзе прыходзілася траціць сродкі на кватэры, што каштавала звыш тысячы рублёў.

Наглядаецца цэлы шэраг немэтазгодных выдаткаў, фактаў нясур'ёзнага падыходу да набыцьця таго ці іншага матар'ялу. Прыкладам гэтага можа служыць гісторыя з набыцьцём матораў для чоўнаў. Матар'ялы гэтыя каштавалі каля 2 тысяч руб. (набыты ў прыватніка), а карысьці ня далі ні на грош.

Прыкладам безгаспадарнасьці можна назваць закупку тэхнічным кіраўніком работ тав. Гнеўкам дарагога альбому работ, які каштаваў да 2 тысяч руб.

Дрэнная становішча выяўлена і ў галіне догляду за трактарамі, наогул, [illegible] належныя памяшканьні для трактараў своечасова ня былі пабудаваны. Трактары знаходзіліся пад адкрытым небам. Неразьбярыха была з кіраўніцтвам трактарнай базы ў тым, што гэтая база адначасова была падпарадкавана двум кіраўніцтвам: кіраўніцтву калфонду і кіраўніцтву саўгасу. Вядома, ад такога двааўладзтва добрага нічога не атрымалася. У выніку, трактарная база ня выканала свайго пляну па ўзьняцьці цаліны.

Разам з усімі гэтымі фактамі выяўлена, што сродкі, якія адпушчаны на гаспадарчае ўпарадкаваньне калфонду, поўнасьцю не скарыстаны, што паміж тэхнічным кіраўніком калфонду і спэцыялістамі Наркамзему былі нездаровыя адносіны, што з боку Наркамзему было слабае кіраўніцтва роботамі на калфондзе.

Акрвыканком, абгаварваючы вынікі гэтага абсьледваньня, вынес шэраг практычных пастаноў па выжываньню выяўленых недахопаў і непарадкаў, якія існавалі да гэтага часу на калфондзе Мар'іна.

Наркамзему ў сваю чаргу трэба прыняць шэраг залежачых ад яго мер, каб унесьці строгую пляновасьць і сыстэматычнасьць у будаўніцтве на Мар'іна'скім калфондзе.

Д. А.

Рэвалюцыйная арганізацыя мастакоў Беларусі (РОМБ) выказвае сваё спачуваньне члену ЦБ арганізацыі **А. Грубэ** з прычыны сьмерці яго жонкі скульптара

Анастасіі Шашалевіч-Грубэ.

У Савеце Ваяўнічых Бязбожнікаў

Рэспубліканскім Саветам Ваяўнічых Бязбожнікаў БССР разасланы месцам указаньні адносна 4х удзелу ў правядзеньні Міжнароднага Камуністычнага Жаночага Дню ў гэтым годзе. У часопісу „Работніца і Сялянка" будзе зьмешчаны адпаведны артыкул.

11-га лютага г. г. арганізацыя Беларускіх бязбожнікаў падпісала дагавор па сацспаборніцтва з Бязбожнікамі Заходняй Вобласьці РСФСР.

НОВЫЯ КНІГІ

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Белдзяржвыдавецтва.

1. **„Чырвоныя ўсходы"** М. Пігулеўскі. Кніжка для чытаньня і работы ў першай групе. Частка другая. Навукова-Мэтодолёгічным Камітэтам пры НКА БССР рэкамэндавана ў якасьці падручніка для 1-га году навучаньня. Стар. 302, цана 80 кап.

2. **„Падручнік хэміі"** Сазонаў і Верхоўскі. Выданьне трэцяе. Пераклад з 4-га расійскага выданьня. Пад рэдакцыяй А. Дашкевіча. Стар 203, цана 1 руб.

3. **„Першая ўсебеларуская выстаўка сельскае гаспадаркі і прамысловасьці"** П. М. Сяргейчык. Стар. 72, цана 30 кап.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

на 20-ае лютага 1930 г.

	Куп.	Прад.
1-я 6 проц. выйгр. паз.	4-90.5	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	130.20	132.20
Выйгр. пазыка 1929 г.	101-25	101-65
10 проц. выйгр. паз. 27 г. 26-32	—	
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г. 5.	—	
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.—	10-35
1-я выйг. паз. індустр. 27 г.	26.62.5	26-72.5
2-я „ „ „ проц.	25-98,5	26-08,5
2-я „ „ 6-проц.	25-61	25-71
11 проц. паз 28 г.	105.27	105 32
Пазыка Масавету	25.12	25.22
9 проц. пазыка 1930 г.	50.15	50.25

Апавяшчэньні

22-2-30 г., а 3 г. дню адбудзецца пасяджэньне аб'яд. бюро скаргаў НК РСІ і мен. АКК-РСІ у памяшканьні лен. кутку каўбаснай ф-кі Белмясгандлю (Маскоўская 12), на яком будуць разгледжаны наступныя справы:

1) Аб дрэнным хаваньні паперы рулонай для газэт на базісным складзе Савгандльфлёту.

2) Справа па карэспанд. з рэд. газ. „Рабочий"—„Казка аб кратох".

3) Справа па заметцы з газ. „Зьвязда" № 287 ад 16-12-29 г. „Чаму мы павінны есьці брудную каўбасу".

Усе т.т., якіх гэтыя справы датычацца, павінны зьявіцца.

Выклікаюцца рабочыя засядацелі бюро скаргаў т. т. Навіцкі, Лунін, Кацэнельсон—бойня, Фейгін і Пятрушкін—шчэлф ка; Макоўскі, Бэнэсон і Смусь—шпалерная ф-ка, Міндэль, Гальперын, Белаус і Кучынскі—зав. „Чырвоная Зорка"; Мякусэвіч, Сідаровіч і Негневіцкі—п.-к. шчэтачнікаў.

ДОМ АСЬВЕТЫ

22-2 а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца сход настаўнікаў 3-х груп школ гораду Менску.

Парадак дню:

1) Разьвіцьцё вуснай і пісьмовай мовы ў 3-й клясе (дакл. т. т. Шац і Болбат).

2) Ацэнка падручніка „Чырвоная Беларусь".

— Сэкцыя навуковых працаўнікоў даводзіць да ведама ўсіх навуковых працаўнікоў, што з 20 лютага г. г. распачнецца падрыхтоўчая кампанія па набору членаў сэкцыі для пасылкі на курорты. Анкеты можна атрымаць у МК і ў клюбе нав. працаўнікоў у т. Юдовіча. Запоўненую анкету трэба зьвярнуць не пазьней 1 сакавіка г. г.

— Сёньня 20-II у доме Працасьветы адбудзецца вечар І і II групкому і МК і школы, прысьвечаны трохмесячніку беларускай пралетарскай культуры і культуры нацменшасьцяй.

Праграма.

1. Даклад аб трохмесячніку.

2. Даклад тав. Рафальскага аб шляхох „ГОСЭТА", сцэны і танцы з прэм'ера „Джым Купэркой".

3. Даклад т. Дрэйзіна аб беларускай музыцы за Кастр. пэрыяд. Выступленьні музтэхнікуму і белкапэлі.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ

СЬПІС

кіно-фільмаў, якія рэкамэндуюцца да пастаноўкі ў вайсковых і рабочых клюбах у дні юбілею 12 гадавіны Чырвонай арміі

1. Браняносец Пацёмкін.
2. Канец С.-Пецярбургу.
3. Маці.
4. Машыністы Ўхтомскі
5. Зьвяржэньне дынастыі Раманавых.
6. Транспарт агню.
7. Арсэнал.
8. Навальніца.
9. Бэнэфіс Клёўна Жоржа.
10. Бухта сьмерці.
11. У тылу ў белых.
12. Вецер.
13. Два бранявікі.
14. Два дні.
15. Яе шлях.
16. Законы шторму.
17. Залаты запас.
18. Хатка на Байкале.
19. Крыты фургон.
20. Чырвоныя дзьяваляты.
21. Лявон Куцюр'е.
22. Лясная быль.
23. Мост праз Выпь.
24. Мяцеж.
25. Масква ў Кастрычніку.
26. Начны рамізьнік.
27. Кастрычнік.
28. Першы карнет Страшнёў.
29. Патомак Чынгіс-Хана.
30. Апошні атракцыён.
31. Сорак першы.
32. Цяжкія гады.
33. Укразія.
34. Чорнае сэрца.
35. Вялікі шлях.
36. Адзінаццаты.
37. Вадаварот.
38. Джальма.
39. Крапыш.
40. Чырвонафлёцец Янка Галай.
41. Усесаюзная спартакіада.
42. Два супрацоўнікі
43. Дні барацьбы і перамог.
44. Чырвоная армія на варце СССР.
45. Пяць у яблычка.
46. Палоньнікі мора.
47. Сёмы спадарожнік.
48. Штурм з неба
49. Вайсковая сабака на службе Чырвонай арміі.
50. Танкі.
51. Хвоі гамоняць.
52. Асобая Далёка-Ўсходняя.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА". З панядзелка 17 лютага **„Чалавек, які сьмяецца"** ПАЧАТАК А 7 ГАДЗІНЕ.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». СЁНЬНЯ І ШТОДНЯ з прычыны вялікага посьпеху 2-гі тыдзень пастаноўкі **„ТРАНСПАРТ АГНЮ"** Звыш праграмы кіно-часопіс „Савецкая Беларусь" № 2—Белдзяржкіно. Пачатак а 7 гадз.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ". З панядзелка 17 лютага 2-ГІ ТЫДЗЕНЬ **„МЁРТВАЯ ПЯТЛЯ"** драма ў 8 частках. Пачатак а 7 гадзіне.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР". З панядзелка 17 лютага МАСТАЦКІ ФІЛЬМ 1) **„Вайсковыя сабакі"** у 5 частках. НАВУКОВЫ ФІЛЬМ 2) **„Вада і яе энэргія"** у 3-х частках. ПАЧАТАК А 2 ГАДЗІНЕ.

Эльвод абвяшчае, што 23 лютага г.-году з 1-й гадзіны ўначы да 6 гадзіны раніцы будзе спынена падача **ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ** з прычыны рамонту параправоду да турбіны.

ВЫШЛА З ДРУКУ І ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ **В. РАМАНАЎ.—ЧАМУ І ЯК ТРЭБА ЎЗЬНІМАЦЬ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ**

—) ЗЬМЕСТ КНІЖКІ (—

Рост прадукцыйнасьці працы паляпшае матэрыяльна-культурны дабрабыт рабочых.

Саюз паміж горадам і вёскай.

Узмацняць абароназдольнасьць нашай краіны.

Наша бліжэйшая задача—дагнаць і выперадзіць перадавыя капіталістычныя краіны.

Ленін аб прадукцыйнасьці працы.

За працоўную дысцыпліну.

Рабочы—гаспадар дзяржаўнага прадпрыемства

Забясьпечыць інжынэрна-тэхнічнаму пэрсаналу нармальныя абставіны для работы.

Дапамагайце тэхнічна-нармавальнаму бюро.

Забясьпечыць прамысловасьць кваліфікаванымі рабочымі.

Сыстэма заработнай платы і продукцыйнасьць працы.

Увага вытворчым нарадам.

Дарогу вынаходзтву.

За соцыялістычныя формы працы.

Стар. 59. Цана 15 кап.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ЎСЯГО НАСЕЛЬНІЦТВА, што Транспартны Трэст са сваімі аддзеламі **перайшоў у памяшканьне—рог Савецкай і Ленінскай вул. № 77-26,** дзе вытвараецца продаж трамвайных і аўтабусных білетаў з 9 гадзін раніцы да 4-х гад. дню.

Транспартны Трэст.

ВЫШЛА З ДРУКУ І ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ **КУДЗІНАЎ— Колгасы І веснавая засеўная кампанія 1930 году.**

—) ЗЬМЕСТ КНІГІ: (—

Асноўныя задачы вытворчай сельска-гаспадарчай кампаніі 1930 г.
Узмацненьне і пашырэньне соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі Беларусі.
Пашырэньне засеўнай плошчы і падвышэньне ўраджайнасьці ў колгасах.
Палепшаньне жывёлагадоўлі.
Забясьпечаньне колгасаў сродкамі вытворчасьці к вясьне.
Машыназабясьпечаньне колгасаў.
Забесьпячэньне колгасаў насеньнем.
Забесьпячэньне колгасаў угнаеньнем.
Агрыкультурныя і агравытворчыя мерапрыемствы ў колгасах.
Палепшаньне рольніцтва.
Мерапрыемствы па павялічэньню і палепшаньню кармовай базы ў колгасах.
Тэхнічныя культуры ў колгасах.
Мерапрыемствы па жывёлагадоўлі.
Організацыя спэцыяльных жывёлаводных колгасаў.
Організацыя прамысловага птушніцтва ў колгасах.
Трусаводзтва ў колгасах.
Пчалярства ў колгасах.
Мерапрыемствы па садоўніцтву і гародніцтву ў колгасах.
Колгасы павінны поўнасьцю колектывізаваць асноўныя сродкі вытворчасьці.
Колгасы павінны зрабіцца прыкладамі высокай сьвядомасьці.
Уся грамадзкасьць на дапамогу колгаснаму будаўніцтву.

СТАР. 135 ЦАНА 25 кап.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

Менскае садова-гароднае т-ва перадае ўсе функцыі, права і абавязацельствы па дагаворам з установамі Менскаму (міжраённаму) саюзу садова-гародных і пчалярных калектыўных гаспадарак „Менрайсадкалгассаюзу" *Менск, Гандлёвая 50, тэлеф. 2-98,* куды і належыць зьвяртацца па ўсім справам.

Старшыня Менрайсадкалгассаюзу Раскін.

Менскі акруговы інспэктар гандлю даводзіць да Усеагульнага ведама, што ім на падставе паламэньня аб гандлёвай рэгістрацыі 16 лютага 1930 г. унесена ў кнігу „Е" 3-га разьдзелу гандлёвага рэестру СССР па Менскай акрузе пад № 35. Кантора Камэрцыйнага агента „УГЛЕСБЫТ" саюзу вугля па БССР. Прадмет дзейнасьці: рэалізацыя мінэральнага апалу прадпрыемствам і трэстам Саюзвугалю па БССР. Заг. філіялу: ПЯСКОЎСКІ, КАНСТ. ІГН. *Месцазнаходжаньне: Менск, Камсамольская № 14* Нам. Мен. Акр. Інспэктар гандлю ЭПШТЭЙН.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Каапэрац. кніжка № 3187 Сакалоўскага М., выд. барысаўск. прыгар спаж. т-вам, кв. 61-п.

— Сяброўскі білет № 63334 Гарбачэвіч В. Н., выд. саюзам працаўн. зямлі і лесу, кв. 121п.

— Вучотна конская карт. № 1964 Буйко А., выд. Бібпікім с-с, Нараўлянск. р-ну, кв. 122п.

— Прыпісная дапрызыўная кніжка № 61 Кацмана, выд. Мазырск. ваенкаматам, кв. 123п.

— Сяброўскі білет за № 522 Сьліжовіча М., выд. Калінкавіцк. мясцкомам саюзу працасьветы, кв. 118п.

— Дзьве забори. кніжкі за № 1099 і 3688 Багданіка К., выд. праўл. Мазырск. ЦРК, кв. 65п.

— Паявая кніжка № 2162-2580 Калбаскіна Ф., выд. Ляднянск. спаж. т-вам, кв. 379 п.

— Паявая кніжка № 2214-2625 Рыбакова А. Ф., выд. Ляднянск. спаж. т-вам, кв. 379 п.

— Вайсковая кніжка Чэрняўскага М Р., нарадж. 1905 г., выд. Мазырск. Акр ваенкаматам.

— Паявая кніжка № 746 Яскаўца В. Ф., выд. Калінкавіцк. спаж. т-вам.

— Хлебная карт. № 475 на 2 г. Гінзбург Д. Л., выд. Калінкавіцк. спаж. т-вам.

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ